

**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**31 КАНАЛ**



**Сёння будзе абраны беларускі ўдзельнік дзіцячага «Еўрабачання». А магчыма, удзельніца. Або дуэт. Ці трыа, ці нават цэлы ансамбль. Фінальны канцэрт будзе транслявацца ў прамым эфіры.** СТАР. 6



**Нядаўні маніторынг у гандлёвых цэнтрах Гродзеншчыны паказаў, што толькі ў адным выпадку з дзесяці пакупніку выдаецца дакумент, які пацвярджае факт набыцця тавару.** СТАР. 7

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ВЕРАСНЯ 2012 г. ПЯТНІЦА № 188 (27303) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## БЕЛАРУСЬ ПАВІННА ЗНАЙСЦІ СВАЁ ДАСТОЙНАЕ МЕСЦА Ў ІНФАРМАЦЫЙНЫМ ГРАМАДСТВЕ XXI СТАГОДДЗЯ

**БЕЛАРУСЬ павінна знайсці сваё дастойнае месца ў інфармацыйным грамадстве XXI стагоддзя, атрымаўшы максімальныя выгады ад развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 27 верасня на нарадзе па актуальных пытаннях развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у Беларусі.**

«Рабіць гэта мы павінны не таму, што хочам паказаць, якія разумныя і штосьці можам рабіць. А яшчэ і таму, што гэта павінна прыносіць пэўныя даходы, дывідэнды для нашага грамадства і дзяржавы, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Таму ў Беларусі пытанням інфарматызацыі, развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій мы ўдзяляем пэўную ўвагу, але, магчыма, недастатковую».

Кіраўнік дзяржавы сказаў, што, бадай, гэта першае такое «мерапрыемства, на якім мы дасканала і прынцыпова падыходзім да гэтых пытанняў». Але не апошняе, запэўніў ён.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў: «Інтэрнэт, які апошнія гады развіваецца вельмі бурна, змяніў аблічча людзей, грамадства і дзяржаў на планеце. Пры ўсіх недахопах інтэрнэту ў ім шмат станоўчага, і гэтым станоўчым трэба скарыстацца. Мы абмяркуем, што нам дадаткова для гэтага трэба зрабіць».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Будаўніцтва ў Беларусі сетак новага пакалення, магутных цэнтраў апрацоўкі даных і, магчыма, развіццё на іх базе новых сектараў эканомікі — гэта вельмі важна для нашай краіны». Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што Беларусь, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, з'яўляецца транзітнай дзяржавай: «Мы таксама можам мець з гэтага пэўную выгаду. Я гавару гэта зыходзячы з таго, што мы маем ужо сёння. Давайце абмяркуем гэту праблему з таго пункту гледжання, што ў нас зроблена па названым напрамку, якія праблемы, якія магчымыя праекты і як мы іх будзем вырашаць».

Аднак, укладваючы грошы, трэба мець на ўвазе не толькі чаканыя выгады, але перш за ўсё — нацыянальную бяспеку, дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы выказаў меркаванне, што, магчыма, нейкія праекты варта ў Беларусі прыпыніць, а выдзеліць дзяржаўныя сродкі, напрыклад, на новы праект, калі ён выключна важны, перспектыўны і самае галоўнае — эфектыўны. «Магчыма, нам да гэтай экспертнай работы трэба прыцягнуць і іншых спецыялістаў, падключыць да гэтага пытання ўрад, каб атрымаць адпаведныя ацэнкі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

На нарадзе разгледжаны шэраг канкрэтных праектаў і прапаноў у сферы інфармацыі і камунікацый.

Як адзначыў па выніках нарады памочнік Прэзідэнта — начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Усевалад Янчэўскі, дадзены даручэнні, якія ў бліжэйшы час будуць рэалізаваны: «Галоўная задача, якую ставіць Прэзідэнт, — дабіцца таго, каб Беларусь у сферы інфармацыі і камунікацый стала ў адзін рад з самымі перадавымі дзяржавамі свету. Важна не толькі стварыць сучасную інфраструктуру, сеткі новага пакалення, цэнтры апрацоўкі даных, але вельмі важна на базе гэтай інфраструктуры пачаць будаваць тое, што ва ўсім свеце называюць лічбавай эканомікай і што прынясе краіне і яе грамадзянам новыя крыніцы даходаў, новыя рабочыя месцы».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## НЕ ТОЛЬКІ ЭКАНАМІЧНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**АСТРАХАНСКАЯ вобласць можа стаць для Беларусі пляцоўкай для руху ў Каспійскі рэгіён, дзе вельмі запатрабавана беларуская прадукцыя. Перспектывы пашырэння супрацоўніцтва Беларусі і гэтага расійскага рэгіёна абмеркавалі 27 верасня Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка і губернатар Астраханскай вобласці Аляксандр Жылкін.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы лічыць, што ў Беларусі і Астраханскай вобласці ёсць шырокія магчымасці для інтэнсіфікацыі ўзаемадзеяння.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь разглядае Астраханскую вобласць як надзейнага і перспектыўнага партнёра. Гандлёвы абарот Беларусі і гэтага расійскага рэгіёна за апошнія тры гады павялічыўся ў тры разы. У той жа час Прэзідэнт лічыць, што бакі маюць значна большыя перспектывы і могуць значна перасягнуць гэтыя аб'ёмы ўзаемнага гандлю.

На думку Прэзідэнта, менавіта на ўзроўні прамых сувязяў з расійскімі рэгіёнамі закладваецца аснова паспяховага эканамічнага ўзаемадзеяння дзвюх дзяржаў.

«Нам неабходна больш актыўна выкарыстоўваць патэнцыял Мытнага саюза, Адзінай эканамічнай прасторы, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — Упэўнены, суб'екты гаспадарання нашых краін яшчэ далёка не вычарпалі магчымасці для інтэнсіфікацыі ўзаемадзеяння».

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што простыя таварныя адносіны — гэта ўжо ўчарашні дзень. «Сёння для таго, каб упэўнена глядзець у будучае, неабходна выводзіць двухбаковае супрацоўніцтва на якасна новы ўзровень і сумесна рэалізоўваць узаемавыгадныя праекты», — лічыць кіраўнік дзяржавы. СТАР. 2

# ДЗЕДАВА МАСЛАБОЙКА НЕ СУМУЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**12-гадовая Алеся, 9-гадовы Рыгорка і 6-гадовая Кацярына БАРОЎСКІЯ — дзеці адной з самых працавітых сем'яў у вёсцы Прыстромы Смалявіцкага раёна. Змалку бацькі далучаюць іх да хатніх спраў, смела давяраюць працу на агародзе, догляд жывёлы: у гаспадарцы ажно восем дойных рагуль. А ўжо калі трэба малако збіць на смятану ці масла (на фотаздымку) — лепшых памочнікаў не знойдзеш. Дарэчы, сям'я Бароўскіх штогод з'яўляецца раённым лідарам па здачы дзяржаве малака.**

**Кацярынка пойдзе ў школу толькі на наступны год. А Рыгор і Алеся — вучні Прылепскай базавай школы, не толькі паспяхова вучацца, але і актыўна ўдзельнічаюць у гуртковым і спартыўным жыцці навучальнай установы. Займаюцца нават краязнаўчай і музейнай справай. Заўтра дзеці Бароўскіх будуць прадстаўляць сваю школу на раённым свяце ў Смалявічах.**

■ «Прамая лінія»

## ЭМІСІЙНЫХ ГРОШАЙ НЕ БУДЗЕ, БЕЛАРУСКІХ ТАЛЕРАЎ — ТАКСАМА. ДЭНАМІНАЦЫЯ МАГЧЫМА, АЛЕ НЕ РАНЕЙ ЯК ПРАЗ ГОД



Фота Уладзіслава КУЛЕЦКАГА.

**На мінулым тыдні ў нашай газеце адбылася «прамая лінія» з удзелам старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Надзеі Андрэеўны Ермаковай. Яна адказала на ўсе пытанні чытачоў газеты.**

**Вольга НОВІК,** *г. Мінск:*

— Спадарыня Ермакова, да вас ёсць некалькі вострых пытанняў. Зараз у нас заробкі налічваюцца ў мільёнах. Мабыць, для дзяржавы, ды і для людзей, «весці» разлікі такімі буйнымі сумамі не зусім зручна. Ці плануецца ў сувязі з гэтым правесці дэнамінацыю? Я недзе чула, што ўжо раней была надрукавана новая беларуская валюта — талеры. Гэта сапраўды так? Ці не пацерпяць ад дэнамінацыі звычайныя людзі?

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— Адразу аб талерах. Такой надрукаванай валюты ў нас няма, ды і не было ніколі. Гэта звычайныя чуткі.

Што датычыць дэнамінацыі, то, на мой погляд, у сярэдзіне наступнага года мы можам пачынаць разглядаць гэтае пытанне. Чаму толькі ў наступным годзе, а не зараз? Сапраўды, даходы насельніцтва растуць, цэны таксама павялічваюцца. Нярэдка нам прыходзіцца мець справу з лічбамі, якія ўтрымліваюць шмат нулёў. Аднак, усе гэтыя нулі пакуль укладваюцца ў камп'ютары і калькулятары, а грашовыя купюры — змяшчаюцца ў нашы кашалькі. Але самае галоўнае, што для правядзення дэнамінацыі неабходны адпаведныя эканамічныя ўмовы, перш за ўсё — нізкі ўзровень інфляцыі. Таму сённяшняя сітуацыя ў эканоміцы, на фінансавым і валютным рынках пакуль не дазваляе нам весці размову аб хуткай дэнамінацыі.

**«Нацыянальны банк не будзе друкаваць нічым не забяспечаных грошай — гэта забаронена на заканадаўчым узроўні».**

Што датычыць наступстваў дэнамінацыі, то ад яе ніхто не павінен пацярпець, паколькі гэта працэс, хутчэй, тэхнічны, звязаны са звычайным «адкідваннем» нулёў. Таму ў любым выпадку баяцца дэнамінацыі не трэба. Тым больш, паўтаруся, сёння гэтае пытанне пакуль не актуальнае. СТАР. 2

## ЦІ ГАТОВЫ НАШЫ ЖЫЛЛЁВА-КАМУНАЛЬНЫЯ СЛУЖБЫ ДА ЗІМЫ?

**У гэтыя дні ў краіне завяршаюцца работы па падрыхтоўцы аб'ектаў ЖКГ да працы ў асенне-зімовым сезоне. Цалкам яны павінны быць выкананы да 1 кастрычніка, а афармленне пашпартоў гатоўнасці цеплакрыніц і спажыўцоў цеплавой энергіі — да 15 кастрычніка.**

І, як запэўнівае **намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь ТРУБІЛА,** да пачатку ацяпляльнага сезона ўсе заданні будуць выкананы, пашпарты гатоўнасці будуць атрыманы ў поўным аб'ёме і ў тэрмін. СТАР. 2

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 19° |
| Віцебск | + 13° |
| Гомель | + 19° |
| Гродна | + 17° |
| Магілёў | + 15° |
| Мінск | + 15° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.09.2012 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8440,00 ▼ |
| Еўра | 10870,00 ▼ |
| Рас. руб. | 270,50 ▼ |
| Укр. грыўня | 1036,06 ▼ |

## ПАМЯТНЫЯ МАНЕТЫ ДА ЗІМОВЫХ АЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ

Нацыянальны банк уводзіць сёння ў абарачэнне памятныя манеты «Алімпійскія гульні 2014 года. Лыжныя гонкі»: дзве сярэбраныя (наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 925, масай 28,28 грама, дыяметрам 38,61 міліметра; і наміналам 100 рублёў, пробай сплаву 999, масай 155,5 грама, дыяметрам 65 міліметраў) і адну залатую (наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 999, масай 3,11 грама, дыяметрам 16 міліметраў). Усе тры манеты адчаканены ў Германіі на манетным двары ТАА «Б. Х. Маерс Кунстпрэгеанштальт» якасцю «пруф». Тыраж: сярэбранай (20 рублёў) — 5000 штук, сярэбранай (100 рублёў) — 750, залатой — 1500.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Адзінаццатая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання пачне сваю работу 2 кастрычніка 2012 года ў 10 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 2 кастрычніка 2012 года з 9.00 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЯПОНСКІЯ ФІЗІКІ СІНТЭЗАВАЛІ 113-Ы ЭЛЕМЕНТ ТАБЛІЦЫ МЕНДЗЯЛЕЕВА




Японскія навукоўцы з фізічнага цэнтра RIKEN абвясцілі, што ім удалося сінтэзаваць атам 113-га элемента табліцы Мендзялеева. Гэты элемент быў упершыню атрыманы расійскімі і амерыканскімі фізікамі ў 2003 годзе ў эксперыментах па сінтэзе 115-га элемента, але гэта адкрыццё яшчэ не прызнана Міжнародным саюзам тэарэтычнай і прыкладной хіміі. На думку японскіх навукоўцаў, цяпер саюз можа прызнаць іх адкрыццё. У такім выпадку японскія навукоўцы ўпершыню ў гісторыі атрымаюць права даць назву новаму элементу табліцы Мендзялеева.

### СТВАРАЛЬНІК «ПАЛІТЫЧНАЙ» ГАРЭЛКІ ПАКРЫЎДЗІЎ ПРЫХІЛЬНІКАЎ ЦІМАШЭНКІ

Расійскі маркетолаг Станіслаў Каўфман, якому належыць ідэя стварэння гарэлачных брэндаў «Путинка» і «Володя и медведи», пачаў чэрпаць натхненне з замежнай палітыкі. Распатэнт ужо ўхваліў яго заяўку на рэгістрацыю таварнага знака «Юлькины сосульки» для выпуску смактулек. Па словах маркетолага, новыя цукеркі будуць выпускацца ў форме знакамітай касы экс-прэм'ера Украіны Юліі Цімашэнкі. «Я выдатна разумею, што для дарослых спажыўцоў гэтая назва звязана з пэўным палітычным персанажам, — распавёў сам Каўфман. — Але, улічваючы, што асноўны спажывец гэтай групы тавараў — дзеці, я стараўся зрабіць тавар максімальна вясёлым і пазітыўным. Мне здаецца, што «Юлькины сосульки» — вельмі задзірыстая назва, дзецям павінна спадабацца».

### ПІВА РАТУЕ АД МЫШАЧНАЙ АТРАФІІ?

Універсітэт Такусіма высветліў: злучэнне, якое змяшчаецца ў хмелі, падтрымлівае здароўе цягліц, стрымліваючы развіццё мышачнай атрафіі. Гаворка ідзе пра флаваноід 8-PN, перадае The Daily Mail. На жаль, у піве злучэнне можна знайсці ў малой канцэнтрацыі. Навукоўцы падкрэсліваюць: у ячменным напоі ёсць мноства антыаксідантаў і вітамінаў, якія таксама здольныя прадухіліць развіццё хвароб сэрца. Карысней за ўсё цёмнае піва (шмат жалеза і антыаксідантаў). Навукоўцы плануюць выкарыстаць вынікі даследавання для стварэння паўнавартасных лекаў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### АМЕРЫКА АБВЯСЦІЛА АСАНЖА ВОРАГАМ ДЗЯРЖАВЫ

Міністэрства абароны ЗША афіцыйна абвясціла заснавальніка WikiLeaks Джуліяна Асанжа, які зараз хаваецца ў пасольстве Эквадора ў Лондане, ворагам дзяржавы. Сам жа сайт прызнаны ў краіне пагрозай нацыянальнай бяспецы, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на дакументы амерыканскай контрразведкі, з якіх быў зняты грыф «сакрэтна».



У дакументах гаворыцца, што вайскоўцы, якія якім-небудзь чынам кантактуюць з Wikileaks або з тымі, хто падтрымлівае гэты вэб-сайт, могуць быць абвінавачаны ва «ўзаемадзеянні з ворагам». Максімальнае пакаранне па такім абвінавачванні — смяротнае пакаранне.

Варта адзначыць, што статус «вораг дзяржавы» раней быў замацаваны Пентагонам за «Аль-Каідай», якая стаіць за тэрактамі ў ЗША 11 верасня 2001 года, і рухам «Талібан», супраць якога цяпер ваююць у Афганістане амерыканскія войскі.

КОРАТКА

Сярэднямесячная зарплата ў пяці раёнах Мінскай вобласці ў жніўні гэтага года склала $500 у эквіваленце.

У Мінску на 1 студзеня гэтага года колькасць жыхароў, старэйшых за працаздольны ўзрост, склала 387,6 тыс. чалавек, з іх ва ўзросце 60-74 гадоў — 226,3 тыс. чалавек, 75-89 гадоў — 82,5 тыс. чалавек, 90 гадоў і старэйшых — 3,7 тыс. чалавек.

У Беларусі выйдзе 20-ы том збору твораў Якуба Коласа: у ім змешчаны невядомыя раней матэрыялы выдатнага беларускага пісьменніка. Выхад выдання прымеркаваны да 130-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры.

## ЦІ ТРЭБА Ў ШКОЛЕ ПАВЯЛІЧВАЦЬ КОЛЬКАСЦЬ ГАДЗІН ПА МАТЭМАТЫЦЫ І ФІЗІЦЫ?



**Вольга СІНАЙСКАЯ, маркетолаг:**

— Дзеці і так у школе перагружаныя, але, мяркуючы па выніках тэсціравання, якое праводзіцца кожны год, навучанне лепшым не становіцца. Мне здаецца, што ўсё залежыць не ад колькасці гадзін, а ад якасці выкладання. У першую чаргу варта заняцца вучэбнымі праграмамі, а не нагружаць дзяцей дадатковымі ўрокамі. Калі змяніць праграму, цалкам магчыма палепшыць якасць выкладання пэўных прадметаў. Фізіка і матэматыка патрэбны не ўсім дзецям, тым больш у павялічаным аб'ёме, як плануюць зрабіць.



**Дзмітрый, праграміст:**

— Калі б выкладанне нейкіх прадметаў паменшылі, а фізікі і матэматыкі павялічылі, гэта было б карысна. А проста павялічваць колькасць урокаў наогул і рабіць канікулы дзяцей больш кароткімі — не трэба. Дзецям і так няма калі адпачываць. Я таксама за тое, каб у школе захаваўся пяцідзённы вучэбны тыдзень. Я вучыўся ў цудоўнай школе, у мяне былі добрыя выкладчыкі, а што перашкаджае сёння даваць добрыя веды без павелічэння колькасці ўрокаў? Іншая справа, трэба вырашаць праблему з цякучасцю кадраў у школе. Мая жонка — былая настаўніца, таму «кухню» я ведаю. Каб не было цякучкі кадраў у школе, з настаўнікаў трэба зняць усю лішнюю нагрузку. Напрыклад, самая «непрыемная» рэч у школе — «усенавуч». Хіба гэта правільна, калі маладых дзяўчат, якія толькі прыйшлі ў школу працаваць пасля заканчэння ВНУ, прымушаюць хадзіць часам і «па прытонах»? Шмат настаўнікаў разбягаюцца з-за таго ж класнага кіраўніцтва. Колькасць гадзін, якія афіцыйна выдзяляюцца на класнае кіраўніцтва, зусім не супадае з тым, колькі гэта рэальна займае. Калі ў настаўніка няма адпачынку нават на выхадных, якая можа быць якасць адукацыі? Замест таго, каб рыхтавацца да ўрока, настаўнікі вымушаны запаўняць вялікую колькасць, па сутнасці, «макулатуры» — справаздач ва ўсе інстанцыі...



**Кацярына ІВАШКА, студэнтка:**

— Безумоўна, у школе трэба павялічваць колькасць гадзін па матэматыцы. Яна патрэбна ўсюды: у тэхнічных і ў гуманітарных ВНУ, пры падрыхтоўцы самых розных спецыялістаў, у тым ліку і ў лінгвістычных універсітэтах. Лічу, такі крок паспрыяе таму, што дзеці гэты прадмет будуць лепш ведаць. Што датычыцца фізікі, гэты прадмет павінен быць профільным. Напэўна, колькасць гадзін трэба павялічваць толькі для тых дзяцей, якім яна спатрэбіцца ў будучыні.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ. Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

# ЭМІСІЙНЫХ ГРОШАЙ НЕ БУДЗЕ, БЕЛАРУСКІХ ТАЛЕРАЎ — ТАКСАМА. ДЭНАМІНАЦЫЯ МАГЧЫМА, АЛЕ НЕ РАНЕЙ ЯК ПРАЗ ГОД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Іван ГАЛОЎСКІ,** *г. Маладзечна:*

— Надзея Андрэеўна, апошнім часам шмат чаго гаварылася аб стварэнні Саюзнай дзяржавы разам з Расіяй, аб Адзінай эканамічнай прасторы і гэтак далей. А ці будзе ўведзена адзіная валюта? Калі гэта можа адбыцца і што гэта будзе за валюта? Ці не згубіць наша краіна ў сувязі з гэтым сваю незалежнасць?

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— Мы можам згубіць незалежнасць, калі перададзім свой эмісійны цэнтр у Расійскую Федэрацыю. Аднак падобным чынам пытанне сёння не стаіць. Цяперашні этап развіцця Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі не прадугледжвае стварэння адзінага эмісійнага цэнтра. Далей жыццё пакажа, як будуць развівацца інтэграцыйныя працэсы.

**І. Г.:**

— Атрымліваецца, што сёння наш Саюз з Расіяй, лічы, у падвешаным стане?

**Н. Е.:**

— Не. Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі зараз — самы «прасунуты» і эфектыўны інтэграцыйны праект на постсавецкай прасторы. Тым не менш, наша міждзяржаўнае ўзаемадзеянне цяпер знаходзіцца на тым узроўні, які не прадугледжвае ўвядзенне адзінай грашовай адзінкі. Таму ў бліжэйшы час у кожнай краіны будзе свая валюта.

**Таццяна САМСОНАВА,** *г. Мінск:*

— Мы з мужам здымаем кватэру ў сталіцы за долары. Днямі, калі набывалі долары ў абменніку (трэба было 250 USD), сталі пэўны час у чарзе, бо людзі больш куплялі валюту, чым здавалі. Няўжо ў банкаў зноў існуюць цяжкасці з валютай?

**«Мы можам згубіць незалежнасць, калі перададзім свой эмісійны цэнтр у Расійскую Федэрацыю. Аднак падобным чынам пытанне сёння не стаіць. Цяперашні этап развіцця Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі не прадугледжвае стварэння адзінага эмісійнага цэнтра».**

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— Сапраўды, апошнім часам насельніцтва стала больш купляць замежнай валюты. Каб высветліць, на якія мэты яна набываецца, нашы спецыялісты ў мінулыя выхадныя зрабілі выбарачнае апытанне сярод пакупнікоў валюты. Дык вось, частка з іх, як і вы, набывалі долары для бягучых разлікаў. Хаця тут варта адзначыць, што ўсе, хто разлічваецца за здымную кватэру доларамі, робіць гэта нелегальна, бо ў дагаворы аб арэндзе прыватнага жылля замежная валюта фігураваць не можа.

Акрамя таго, апытанне паказала, што пэўная частка людзей купляе валюту і ад страху абясцэньвання ўласных зберажэнняў. Аднак хацелася б падкрэсліць, што сёння працэнтная стаўка па дэпазітах у беларускіх рублях значна вышэй, чым па валютных укладах. Гэта значыць, захоўваць зберажэнні ў нацыянальнай валюце больш выгадна, чым у замежнай. Асобныя грамадзяне хвалююцца, што пасля парламенцкіх выбараў наш рубель можа абясцэніцца. У Нацыянальнага банка такіх апасенняў няма, паколькі ні ў эканоміцы, ні ў фінансавай сферы няма аб'ектыўных прычын для рэзкага змянення сітуацыі. Таму да павышэння попыту на наяўную валюту мы ставімся спакойна — людзі маюць права самастойна распараджацца сваімі грашыма.

**Т. С.:**

— Ці можа Нацбанк прымусіць прыватныя банкі прадаваць больш валюты насельніцтву?

**Н. Е.:**

— А навошта іх прымушаць? Банкі самі зацікаўлены актыўна працаваць на гэтым рынку, бо на абменных аперацыях яны зарабляюць грошы. Калі недзе ў абменніку чарга, то можна звярнуцца ў другі. У Мінску банкаў і абменнікаў шмат. Валюты там хапае.

**Наталля МІЗЭРНІК,** *Брэсцкая вобласць:*

— Надзея Андрэеўна, наша сям'я трапіла ў складанае фінансавае становішча, бо трэба плаціць шмат грошай па жыллёвым крэдыце. У сям'і трое дзетак, адзін з іх — інвалід. Так здарылася, што ў свой час мы набылі кватэру не па льготным крэдыце, таму па гэтай пазіцыі трэба плаціць каля 1,7 млн рублёў у месяц. Ці ёсць нейкая магчымасць паменшыць для нашай сям'і ўзровень выплат па гэтым крэдыце?

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— Гэты крэдыт вы бралі ў Беларусбанку?

**Н. М.:**

— Так.

**Н. Е.:**

— Скажыце мне ваш хатні адрас, на каго быў выдадзены крэдыт, і пакіньце нумар кантактнага тэлефона. Нашы спецыялісты абавязкова звяжуцца з вамі, разбяруцца з сітуацыяй і паспрабуюць дапамагчы такім чынам, каб працэнтная стаўка па крэдыце стала меншай.

**Ігар ЛЯВОШКА,** *г. Брэст:*

— Калі ў краіне рэальна можна будзе будаваць жыллё па іпатэцы? Жыву я адзін у маленькай кватэры ў доме 1970-х гадоў. Хачу пабудаваць новае і прасторнае жыллё. Льготны крэдыт не дадуць, а камерцыйны «кусаецца»...

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— Напрыканцы жніўня гэтага года Прэзідэнт Беларусі падпісаў новы Жыллёвы кодэкс, які ўступіць у сілу праз шэсць месяцаў з моманту афіцыйнага апублікавання. Гэты дакумент стварае неабходныя прававыя асновы для выкарыстання ў нашай краіне механізмаў іпатэчнага крэдытавання. Калі іпатэка пачне працаваць, то пры вырашэнні жыллёвай праблемы ўжо не трэба будзе шукаць паручыцеляў ці абавязкова мець высокі ўласны даход. Дастаткова будзе пакінуць кватэру ў залог таму банку, у якім вы атрымалі іпатэчны крэдыт. Пры гэтым, зразумела, трэба быць гатовым «развітацца» з жыллём, калі запазычаныя грошы не будуць вяртацца своечасова.

І яшчэ адзін важны момант: не трэба чакаць, што працэнты па іпатэчных крэдытах будуць значна ніжэй, чым па звычайных крэдытах на будаўніцтва. Каб іпатэчныя грошы патаннелі, неабходна выкананне некалькіх умоў. Па-першае, павінен актыўна пачаць працаваць рынак каштоўных папер пад іпатэку, каб банкі атрымалі магчымасць перапрадаваць такія даўгі іншым фінансавым структурам.

Па-другое, трэба ўлічваць, што іпатэка — гэта той жа крэдыт, толькі на крыху іншых умовах. І кошт іпатэчных грошай можа знізіцца толькі разам са зніжэннем кошту крэдытных рэсурсаў у цэлым. А для гэтага неабходна, каб у нашай краіне канчаткова стабілізавалася эканамічная сітуацыя, каб нашы прадпрыемствы выраблялі больш якасную прадукцыю і паспяхова рэалізоўвалі яе, перш за ўсё, за межы рэспублікі.

**Сяргей КАРЖАНЕЎСКІ** *г. Бабруйск:*

— Якой будзе стаўка рэфінансавання ў апошніх лічбах снежня?

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— Чакаецца, што яна будзе не вышэй за 25—26 працэнтаў гадавых.

**С. К.:**

— А ніжэй яна не будзе?

**Н. Е.:**

— Не, не будзе. Стаўка рэфінансавання вызначаецца, зыходзячы з узроўню інфляцыі. Сённяшнія тэмпы росту цэн пакуль не дазваляюць нам разлічваць на больш значнае зніжэнне стаўкі рэфінансавання.

**Алесь ШЫБУТ,** *г. Гродна:*

— Я чуў, што аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва скарачацца не будуць. Значыць чакаецца «росквіт» і льготнага крэдытавання? А для гэтага трэба шмат грошай. Ці не пачне таму Нацбанк друкаваць вялікую колькасць грошай, якія нічым не будуць забяспечаны? Гэта ж можа прывесці да новай хвалі гіперінфляцыі...

**«Што датычыць дэнамінацыі, то, на мой погляд, у сярэдзіне наступнага года мы можам пачынаць разглядаць гэтае пытанне».**

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— Нацыянальны банк не будзе друкаваць нічым не забяспечаных грошай — гэта забаронена на заканадаўчым узроўні. Мы спынілі выдзяленне «доўгіх» крэдытаў камерцыйным банкам. У гэтым проста няма неабходнасці. Наадварот, у асобных банкаў зараз ёсць залішняя ліквіднасць, і Нацбанк яе выводзіць з рынку. Сёлета мы ўжо знялі лішняй ліквіднасці ў аб'ёме каля 10 трлн рублёў. І гэта нармальная практыка ўсіх цэнтральных банкаў свету — такім чынам галоўныя банкі рэгулююць колькасць грошай, якая знаходзіцца ў абарачэнні. Калі будзе з'яўляцца неабходнасць падтрымаць той ці іншы банк грашыма на кароткі тэрмін, Нацбанк мае права гэта зрабіць. Але гэта будуць дарагія грошы, якія сёння каштуюць 50 працэнтаў гадавых.

Друкаваць эмісійныя грошы ні на якія дзяржаўныя праграмы Нацбанк таксама не будзе, у тым ліку і па жыллёвым будаўніцтве. Ільготнае крэдытаванне будаўніцтва будзе скарачацца, хаця агульны аб'ём узвядзення жылля не паменшыцца. Ёсць у людзей грошы для будаўніцтва. Дзяржава будзе фінансаваць толькі



стварэнне інфраструктуры. У наступным годзе асаблівая ўвага будзе надавацца развіццю індывідуальнага будаўніцтва. Аднак і па гэтай лініі не прадугледжана дадатковага льготнага крэдытавання. Перавага будзе надавацца выкарыстанню ўласных сродкаў, а таксама камерцыйным крэдытам.

**Ганна САЛАМАХА,** *г. Мінск:*

— Надзея Андрэеўна, я звяртаюся да вас па просьбе сваёй бабулі, якую турбуе магчымасць кампенсацыі «згарэлых» укладаў савецкага перыяду. У бабулі на кніжцы было больш за 4 тысячы рублёў...

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— Тут я вас не ўзрадую. Ні сёлета, ні ў 2013-м, ні ў 2014-м гадах кампенсацыі «савецкіх» укладаў не будзе. Кампенсацыя згубленых укладаў можа фінансавацца толькі з рэспубліканскага бюджэту, а не шляхам эмісійнага друкавання грошай. Пакуль наш бюджэт не прадугледжвае адпаведных выплат насельніцтву. Аднак пытанне з парадку дня не знята. Дзяржава не адмовілася ад ідэі кампенсацыі ўкладаў савецкіх часоў. Але для гэтага патрэбны адпаведныя фінансавыя рэсурсы, якія неабходна зарабіць у эканоміцы.

**«Звязда»:**

— А з «рэчавымі аблігацыямі» будзе што-небудзь рабіцца?

**Н. Е.:**

— Сапраўды, пасля развалу Савецкага Саюза на руках у нашых грамадзян засталося нямала і так званых «рэчавых аблігацый», і страховак, якія таксама абясцэніліся. Аднак і ў гэтых выпадках размовы аб кампенсацыі пакуль не ідзе: проста няма такой магчымасці.

**«Звязда»:**

— А што наконт «замарожаных» валютных укладаў, якія былі за мяжой?

**Н. Е.:**

— Гэта пытанне трэба вырашаць з банкам БелВЭБ (былы Белзнешэканамбанк). На ім «віселі» гэтыя даўгі.

**Таццяна ШАДЗЕЛКА,** *г. Мінск:*

— Наша шматдзетная сям'я будуе чатырохпакаёвую кватэру. Пад будаўніцтва жылля бралі льготны крэдыт і дадаткова камерцыйны крэдыт у мінулым годзе ў філіяле № 529 Беларусбанка. Крэдытная лінія за кошт рэсурсаў банка была дадзена нам пад 22 працэнты гадавых. Аднак будаўніцтва дома зацягваецца, а яго здача ў эксплуатацыю пераносіцца ўжо ў трэці раз. Кошт будаўніцтва павялічыўся, таму нам зноў неабходна афармляць дадатковы крэдыт за кошт рэсурсаў банка. Цяпер мы можам узяць такі крэдыт ужо пад 17 працэнтаў гадавых. Ці можа Беларусбанк знізіць працэнтную стаўку па першым камерцыйным крэдыце з 22 да 17 працэнтаў гадавых?

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— У выключным выпадку па індывідуальнай заяве банк можа змяніць працэнтную стаўку па раней выдадзеным крэдыце. Для гэтага вам неабходна звярнуцца з адпаведнай заявай да кіраўніка вашага аддзялення Беларусбанка. Калі вам там адмовяць, то звяртайцеся з пісьмовай заявай да старшыні праўлення Беларусбанка. Мы, са свайго боку, накіруем ваш электронны ліст у Беларусбанк з просьбай разгледзець гэтае пытанне станоўча. Запэўню вас, што Беларусбанк заўсёды па-чалавечы ставіўся да фінансавых праблем шматдзетных сем'яў.

**Антон СНІТКО,** *г. Мінск:*

— Надзея Андрэеўна, на якім узроўні плануецца ўтрымліваць інфляцыю ў 2013 годзе?

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— Гэтае пытанне неаднаразова разглядалася на розных узроўнях, у тым ліку на ўзроўні кіраўніка дзяржавы. У падрыхтаваных рашэннях, якія будуць прымацца парламентам, у наступным годзе інфляцыя прапісана ў памеры 12 працэнтаў.

**«Звязда»:**

— Надзея Андрэеўна, на нашу электронную рэдакцыйную пошту чытач «Звязды» Сяргей Таранда даслаў пытанне наконт укладаў у замежнай валюце. На яго думку, валютныя дэпазіты зусім не прывабныя. Так, у Аграпрамбанку даюць 5,5 працэнта, а ў Беларусбанку і ўвогуле — пад 4,5—5 працэнтаў гадавых.

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— Тут усё вельмі проста. Зараз банкаўскай сістэме фінансавыя рэсурсы ў валюце не патрэбны. Таму банкі пачалі зніжаць працэнтныя стаўкі. Сёння ў краіне валюты хапае.



Часам банкі нават маюць пэўныя цяжкасці з рэалізацыяй «валютнага партфеля». Але ж, як вядома, банкі атрымліваюць даход, калі прадаюць грошы. Навошта ж ім прыцягваць ад насельніцтва «дарагую» валюту, якую потым рынак не зможа ў поўным аб'ёме ўспрыняць?

**Алег Вітальевіч,** *г. Мінск:*

— Паважаная Надзея Андрэеўна, мы плануем долевае будаўніцтва ў Мінску. Для гэтага два гады таму сталі ўдзельнікамі «Сістэмы будаўнічых зберажэнняў» ААБ «Беларусбанк» у беларускіх рублях. Банк 3 верасня 2012 года прыняў унутранае рашэнне выдаваць крэдыты ў межах гэтай праграмы, не ўлічваючы працэнт забудовы дома, а непасрэдна па графіку плацяжоў, які ўсталяваны па нашай дамове з забудоўшчыкам, што вельмі спрыяльна для нас. У сувязі з гэтым хачу задаць пытанне, ці будзе вышэйзгаданае рашэнне банка стабільным у доўгатэрміновай перспектыве і ці можам мы быць упэўненыя, што грошы будуць пералічвацца забудоўшчыку без затрымак да канца аплаты кошту жылля пасля заключэння крэдытнай дамовы з банкам?

**«Акрамя таго, апытанне паказала, што пэўная частка людзей купляе валюту і ад страху абясцэньвання ўласных зберажэнняў. Аднак хацелася б падкрэсліць, што сёння працэнтная стаўка па дэпазітах у беларускіх рублях значна вышэй, чым па валютных укладах. Гэта значыць, захоўваць зберажэнні ў нацыянальнай валюце больш выгадна, чым у замежнай».**

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— Нацбанк не можа адказваць за тыя ці іншыя ўнутраныя рашэнні банкаў. Аднак адзначу, што Беларусбанк пры ажыццяўленні тых ці іншых змяненняў па ўмовах крэдытавання заўсёды рабіў гэта толькі на карысць удзельнікаў сістэмы будзберажэнняў. Упэўнена, так будзе і далей.

**Вольга КУДЗІНА,** *г. Мінск:*

— Добры дзень, Надзея Андрэеўна! У мяне да вас такое пытанне. Я трымаю свае зберажэнні ў Беларусбанку ў валюце. Некалькі дзён таму працэнтныя стаўкі па такіх дэпазітах былі зменшаны да 4,5%. Атрымліваецца, што выгадна трымаць грошы ў беларускіх рублях. Мабыць, Нацбанк плануе і па рублёвых укладах таксама зніжаць працэнтныя стаўкі?

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— Нацыянальны банк стаўкі па ўкладах не змяншае. Ён толькі рэгулюе стаўку рэфінансавання. Сёння яна складае 30%. Гэта арыенцір банкам для ўстанаўлення ставак па дэпазітах і крэдытах у беларускіх рублях. Відавочна, што зараз больш выгадна трымаць уклады ў нацыянальнай валюце — 30% значна больш, чым 4,5%. Што да зніжэння ставак па валютных укладах, то Беларусбанк і іншыя банкі ідуць на гэта таму, што ім сёння не патрабуюцца валютныя рэсурсы. Вось яны і робяць валютныя дэпазіты непрыцягальнымі.

**«Звязда»:**

— Дык стаўкі па рублёвых дэпазітах зніжацца не будуць?

**Н. Е.:**

**«...не трэба чакаць, што працэнты па іпатэчных крэдытах будуць значна ніжэй, чым па звычайных крэдытах на будаўніцтва».**

— Гэта вырашаюць самі банкі. Але арыенцір для іх — стаўка рэфінансавання.

**«Звязда»:**

— Значыць, менш яны не могуць зрабіць?

**Н. Е.:**

— Могуць. Ёсць асобныя банкі, якія ўвогуле знізілі стаўку па беларускіх укладах да 24%, каб людзі іх не неслі. Значыць цяпер гэтым банкам не патрэбны дадатковыя рэсурсы ў беларускіх рублях.

**«Звязда»:**

— А каму трэба больш грошай, тыя трымаюць вялікія стаўкі?

**Н. Е.:**

— Зразумела, гэта ж



Фота Уладзіслава КУЛЕЦКАГА.

рынак. Банкі самі ўсё рэгулююць. Напрыклад, Беларусбанку патрэбны большы аб'ём рублёвых рэсурсаў — на тое ж крэдытаванне жыллёвага будаўніцтва, у тым ліку льготнага. Таму ён і стаўку па ўкладах трымае.

**«Звязда»:**

— А тое, што Беларусбанк прапануе зараз датэрміновае пагашэнне па раней узятых крэдытах, таксама звязана з патрэбай у рэсурсах?

**Н. Е.:**

— Так. Справа ў тым, што раней выдадзеныя крэдыты — больш танныя, яны выдзяляліся пад меншы працэнт. Таму зараз банк зацікаўлены вярнуць гэтыя грошы, каб потым зноў «аддаць іх у працу» пад больш высокія працэнты, зарабіць на гэтым прыбытак і накіраваць яго, у тым ліку, на далейшае развіццё свайго бізнэсу — пашырэнне колькасці аказваемых насельніцтву банкаўскіх паслуг, павышэнне іх якасці.

**Сяргей,** *г. Мінск:*

— Добры дзень, Надзея Андрэеўна! Апошнім часам наша краіна брала шмат крэдытаў за мяжой. Я чытаў, што ўжо ў найбліжэйшы час нам трэба выплачваць буйныя сумы — мільярды долараў. А як гэта можа адбіцца на кішэні простага беларуса?

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— На кішэню простага беларуса гэта ніяк не паўплывае. У нас ёсць чым аддаць даўгі. І ў гэтым, і ў наступным годзе. Таму адносна гэтага можаце быць спакойны.

**С.:**

— Але гавораць жа аб тым, што зарплата павінна расці...

**Н. Е.:**

— Ваша зарплата (калі вы працуеце ў бюджэтнай сферы) расце толькі праз тыя падаткі, якія заплацілі ў бюджэт прадпрыемствы і насельніцтва. А вялікія паступленні ў бюджэт могуць быць толькі тады, калі будуць добра працаваць прадпрыемствы і напрацоўваць больш прыбытку. Тыя грамадзяне, якія працуюць на вытворчасці, могуць атрымаць зарплату толькі з той выручкі, якая атрымалася ад продажу прадукцыі. Калі не напрацавалі столькі выручкі, каб зарплату павысіць, то яе і не змогуць павысіць. Усё звязана з вытворчасцю. Зарплата звязана з вытворчасцю, а не з вяртаннем даўгоў. Таму не хвалюйцеся. І Нацбанк, і ўрад свае даўгі змогуць аддаць.

**Марына,** *г. Мінск:*

— Добры дзень! У мяне пытанне, якое, напэўна, ужо ўсіх турбуе. Хацелася б ведаць, ці будзе ў нас дэвальвацыя ў найбліжэйшы час. Ужо ж некалькі разоў казалі аб зарплаце ў 500 долараў. І ўсе ведаюць, чым гэта скончылася. Зараз гэтыя абяцанні ўзнавіліся.

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— Па-першае, зарплату ў 500 долараў ніхто не абяцае. Прэзідэнтам пастаўлена задача перад урадам і кіраўнікамі прадпрыемстваў забяспечыць магчымасць зарабіць такую зарплату. Даць яе проста так ніхто не абяцае. Таму ніхто незаробленую зарплату нікому не дасць. І дэвальвацыі не будзе таксама. Мы летась зрабілі вельмі сур'ёзную дэвальвацыю. Перадумоў, каб рабіць такі крок яшчэ зараз, няма. Інфляцыя за восем месяцаў гэтага года складае 14,6%. Увогуле на 2012 год прагназуецца інфляцыя не вышэй за 22%. Таму няма ніякай неабходнасці рабіць дэвальвацыю. На 2013 год інфляцыя прагназуецца на ўзроўні 12%. Зноў-такі не будзе патрэбы ў дэвальвацыі. А заробак у 500 долараў — гэта патрабаванне да ўрада, да кіраўнікоў прадпрыемстваў, каб у людзей была магчымасць такую зарплату зарабіць.

**Таццяна Георгіеўна,** *г. Лепель:*

— Я жыву ў Лепелі. Наколькі Вы ведаеце, гэта невялікі гарадок. Атрымліваю зарплату, як і амаль усе, на картку Беларусбанка. Але не ва ўсіх крамах, службах і гэтак далей можна расплаціцца карткай. Калі сістэма безнаяўных плацяжоў будзе ўкаранёна ва ўсіх сферах?

**Надзея ЕРМАКОВА:**

— Зараз Нацыянальны банк разам з Міністэрствам гандлю і спажыўкааперацыяй праводзіць работу над тым, каб тэрмінальнае абсталяванне было паўсюдна. Калі ў Лепелі не паўсюль ёсць такая інфраструктура, то я спецыяльна звярну на гэта ўвагу мясцовых улад. Тэрміналы павінны быць паўсюль, дзе ёсць тэлефонная сувязь.

**Т. Г.:**

— Дзякуй. Будзем на тое спадзявацца.

**«Звязда»:**

— Няўжо неўзабаве прыйдзе той час, калі можна будзе абсалютна ў любым месцы расплаціцца карткай?

**Н. Е.:**

— Безумоўна, прыйдзе. Нашы людзі павінны мець магчымасць разлічыцца банкаўскай карткай не толькі ў краме, але і на рынку, і ў таксі. Дарэчы, у Мінску ўжо ёсць таксісты, якія працуюць з тэрміналамі. Але іх пакуль — адзінкі.

Менавіта таму Нацыянальным банкам сумесна з зацікаўленымі міністэрствамі і ведамствамі распрацаваны праект Дзяржаўнай праграмы развіцця сістэмы безнаяўных разлікаў з выкарыстаннем пластыкавых картак, электронных грошай, тэхналогій дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання і іншых сучасных плацежных інструментаў. Калі гэтая праграма будзе прынята, патрабаванне аб паўсюднай наяўнасці плацежных тэрміналаў стане абавязковым, будзе ўзаконена. Адначасова неабходна будзе ўнесці змены ў Закон аб абароне правоў спажыўцоў, каб даць чалавеку магчымасць прад'явіць законныя прэтэнзіі ў выпадку адсутнасці адпаведнага абсталявання там, дзе яно павінна быць.

Зараз праект праграмы развіцця сістэмы безнаяўных разлікаў вынесены на грамадскае абмеркаванне на сайце Нацыянальнага банка, і мы абавязкова ўлічым усе практычныя заўвагі і прапановы, якія паступяць ад нашых грамадзян, пры дапрацоўцы гэтага дакумента.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, Сяргей КУРКАЧ.**

# НЕ ТОЛЬКІ ЭКАНАМІЧНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь гатова ўдзельнічаць у рэалізацыі праграм развіцця Астраханскай вобласці, уключаючы ўдзел у мадэрнізацыі яе прамысловага, сельскагаспадарчага, будаўнічага і жыллёва-камунальнага сектараў.

У прыватнасці, беларускія кампаніі маглі б удзельнічаць у распрацоўцы радовішчаў вуглевадароднай сыравіны ў Астраханскай вобласці. У сваю чаргу Аляксандр Жылкін заўважыў, што Астраханская вобласць мае вялікія запасы вуглевадароднай сыравіны, як газавай, так і нафтавай, шмат стратэгічных радовішчаў.

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў Астраханскай вобласці паслугі беларускіх будаўнікоў, якія маюць значны вопыт праектавання будаўніцтва буйных інфраструктурных, сацыяльных і прамысловых аб'ектаў, а таксама жылля.

Акрамя таго, Беларусь гатова ўдзельнічаць у рэалізацыі ў Астраханскай вобласці праграмы «Чыстая вада» і прапанаваць свае паслугі па мадэрнізацыі сістэмы водазабеспячэння. Дарэчы, у нашай краіне такая праграма працуе ўжо амаль 10 гадоў. Таксама беларусы гатовы падзяліцца вопытам гадоўлі мясной і малочнай буйной рагатай жывёлы, будаўніцтва агароднінасховішчаў, заводаў па перапрацоўцы малака, малочнатаварных комплексаў. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, ёсць шмат тэм для сумеснай работы вучоных не толькі ў аграрнай сферы, але і ў іншых галінах народнай гаспадаркі.

«Словам, нам ёсць што прапанаваць адзін аднаму, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Пры гэтым важна не зацыклівацца толькі на эканоміцы, але таксама развіваць супрацоўніцтва ў ахове здароўя, адукацыі, культуры і турызме».

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў абмеркаваць канкрэтныя і найбольш важныя напрамкі супрацоўніцтва Беларусі і Астраханскай вобласці.

Губернатар Астраханскай вобласці Аляксандр Жылкін прапанаваў Беларусі разглядаць гэту вобласць Расіі як пляцоўку для руху ў Каспійскі рэгіён.

Аляксандр Жылкін адзначыў, што ў Астраханскай вобласці склаліся добрыя адносіны з прыкаспійскімі дзяржавамі. «Мы мяжуем з Казахстанам, Туркменістанам, Іранам, Азербайджанам. Сёння на Каспіі ідзе значнае развіццё эканамічных праектаў, індустрыялізацыя прыкаспійскіх берагоў, і той патэнцыял, які мае Астраханская вобласць у эканамічнай, прамысловай, сельскагаспадарчай сферах, нядрэнна ўпісаўся ва ўсе праекты, якія ідуць на Каспіі», — сказаў губернатар.

Ён падкрэсліў, што многія тавары з Беларусі запатрабаваны ва ўсіх прыкаспійскіх дзяржавах. Што датычыцца Астраханскай вобласці, то тут выкарыстоўваецца 76 працэнтаў сельскагаспадарчай тэхнікі беларускай вытворчасці, што, на думку губернатара, шмат што гаворыць аб якасці беларускай прадукцыі.

Губернатар адзначыў, што для Астраханскай вобласці маюць цікавасць тыя напрамкі, па якіх прапануе супрацоўніцтва беларускі бок, у прыватнасці, у рэалізацыі праграмы «Чыстая вада», у жывёлагадоўлі і іншых.

Аляксандр Лукашэнка і Аляксандр Жылкін абмеркавалі канкрэтныя перспектыўныя напрамкі развіцця супрацоўніцтва, у тым ліку па пастаўках тавараў, сельскагаспадарчай і камунальнай тэхнікі, стварэнню сумесных прадпрыемстваў у сельскай гаспадарцы. У прыватнасці, беларускаму боку цікавы вопыт Астраханскай вобласці ў авечкагадоўлі, развядзенні асятровых парод рыб. Беларусь у сваю чаргу можа падзяліцца тэхналогіямі і вопытам у малочнай і мясной жывёлагадоўлі.

Па выніках сустрэчы адказным чыноўнікам з абодвух бакоў даручана дэталёва прапрацаваць дасягнутыя дамоўленасці і ў самыя кароткія тэрміны перайсці да іх практычнай рэалізацыі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# ЦІ ГАТОВЫ... ДА ЗІМЫ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Так, па словах намесніка міністра, ужо ў поўным аб'ёме выкананы работы па ачыстцы ўнутранай паверхні бойлераў, капітальным рамонце, замене неэканамічных катлаагрэгатаў і іх давядзенні да нарматыўных характарыстык, ізаляцыі цеплавых сетак, прафілактычным аглядзе і рамонце артэзіянскіх свідравін, прафілактычным абслугоўванні і рамонце водазаборных калонак, дэмантажы водanапорных вежаў і інш. На завяршальнай стадыі — работы па выпрабаванні абсталявання кацельняў (99,5% ад задання).

Арганізацыямі ЖКГ створаны запас топачнага мазуту і драўнянага паліва адпаведна на 99% і 98% ад запланаваных аб'ёмаў.

На 98% выканана праверка прыбораў уліку цеплавой энергіі ў жылых дамах, якія знаходзяцца на абслугоўванні ЖКГ (з 16 379 прыбораў цеплавой энергіі праверана 16 016). Гэтыя работы ўжо завершаны ў Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях.

## Некалькі наіўных пытанняў

**Калі плануецца ўключаць ацяпленне?**

Ацяпленне ва ўстановах аховы здароўя, адукацыі, а таксама дашкольных установах уключыцца, калі сярэднясутачная тэмпература паветра на працягу пяці дзён не будзе перавышаць 10 градусаў цяпла. Ацяпленне ў жылым фондзе — калі адпаведная тэмпература не перавысіць плюс 8 градусаў. Затым ацяпленне ўключыцца ў адміністрацыйных і прамысловых будынках.

**Ці будуць пераглядацца тарыфы на паслугі ЖКГ?**

Пакуль цэны на паслугі ЖКГ пераглядацца не будуць. Дарэчы, гэтыя цэны вызначае не Міністэрства ЖКГ, а Міністэрства эканомікі і Савет Міністраў. Што тычыцца ўзроўню кампенсацыі выдаткаў насельніцтва на аказанне жыллёва-камунальных паслуг, то на сённяшні момант у цэлым ён склаўся на ўзроўні крыху больш за 21%.

**Ці плануецца ўводзіць розныя тарыфы на паслугі ЖКГ для багатых і бедных?**

Міністэрства ЖКГ плануе ў бліжэйшы час распрацаваць і прапанаваць ураду механізм пераходу на дыферэнцаваную аплату насельніцтвам паслуг ЖКГ. Аднак якім ён будзе, пакуль цяжка сказаць. Магчыма, грамадзяне з нізкім узроўнем даходаў будуць атрымліваць субсідыі. «Вызначаць і дзяліць людзей на багатых і бедных мы не будзем. Ёсць тарыф на стапрацэнтныя аплаты для насельніцтва, з яго мы і будзем зыходзіць» — сцвярджае Генадзь Трубіла.

**Святлана БУСЬКО.**

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2012 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 8 кастрычніка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Сярод падпісчыкаў 10.10.2012 г. будуць разыграны 7 фенаў, 7 пыласосаў, 1 параварка для Мінскай вобласці. Вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 20.10.2012 г.**

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі **па 31 снежня 2012 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2012 года і пашпарта. **Пасля 31 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 6.09.12 г.

**Тэрмін правядзення гульні — з 8.09.12 па 31.12.12.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2051 ад 28.08.12, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**4 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2012 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку**______________________

______________________________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў**______________________
(аддзяленне сувязі)

______________________**на IV кв. або 2-е паўг. 2012 года**

**Хатні адрас і тэлефон** ________ (індэкс) ________

______________________________________

______________________________________

**Удачы ў розыгрышы!**

## ■ Ну і ну!

# ЖАНЧЫНА ЎКРАЛА Ў ГІПЕРМАРКЕЦЕ 13 ПАР АБУТКУ

**37-гадовай жыхарцы Гродна вельмі спадабалася абутковая крама ў адным з гіпермаркетаў абласнога цэнтра, адкуль яна за два месяцы вынесла 13 пар абутку.**

Жанчына брала абутак са стэлажа, на вачах ва ўсіх прымярала, пасля чаго клала тавар у пакет, а пустую каробку вяртала на месца. І, не заплаціўшы, пакідала гіпермаркет. Так працягвалася да таго часу, пакуль зладзейкай не зацікавіліся аператыўнікі крымінальнага вышуку. Падчас вобыску ў яе дома выявілі некалькі ўкрадзеных пар абутку. Пры гэтым жанчына апраўдваецца тым, што выхоўвае без мужа дзвюх дачок. Маўляў, іх трэба было абуць да школы, а грошай не хапала. Праўда, сярод украдзенага былі не толькі жаночыя мадэлі, але і мужчынскія. Заведзена крымінальная справа па артыкуле «Крадзеж», паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

**Барыс ПРАКОПЧЫК** ■

■ Погляд на праблему

# ЯК ЗМАГАЦЦА З «ШЭРЫМ» РЫНКАМ?

## Не толькі жорсткім кантролем, але і спрыяльнымі ўмовамі для празрыстых разлікаў




Фота Пятра ФАМІНА.

**ТОЛЬКІ падатковымі органамі сёлета ў першым паўгоддзі на Гродзеншчыне выяўлена 380 выпадкаў утойвання выручкі суб'ектамі гаспадарання — гэта ў паўтара раза больш у параўнанні з мінулым годам. А нядаўні маніторынг у гандлёвых цэнтрах паказаў, што толькі ў адным выпадку з дзесяці пакупніку выдаецца дакумент, які пацвярджае факт набыцця тавару. Увогуле ж, паводле ацэнкі Галоўнага ўпраўлення Нацбанка Беларусі па Гродзенскай вобласці, штомесячны абарот «шэрага» рынку складае каля 325 мільярдаў рублёў. Чым гэта пагражае і як максімальна прыцягнуць гандлёвую выручку ў арганізаваны абарот? Меркаванні і прапановы на гэты конт прагучалі за «круглым сталом» у Камітэце дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці з удзелам кіраўнікоў кантрольных, банкаўскіх і прадпрымальніцкіх структур.**

### ЛІБЕРАЛІЗАЦЫЯ НЕ ЎСЁДАЗВОЛЕНАСЦЬ

**Намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю па Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА** зазначыў, што за апошнія гады дзяржавай прынята шмат дакументаў па лібералізацыі эканомікі, стварэнні камфортных умоў для бізнэсу, прадпрымальніцкай ініцыятывы. Прыняты шэраг нарматыўных актаў, якія спрасцілі працэдуры падаткаабкладання, бухгалтарскага ўліку, апрыходавання і спагнання выручкі.

— Аднак, на жаль, не ўсе суб'екты гаспадарання належным чынам успрынялі гэтыя і іншыя крокі дзяржавы. Нягледзячы на іх, сітуацыя з утойваннем даходу і заніжэннем выручкі пагаршаецца. І ніводная дзяржава гэтага не пацерпіць, бо калі грошы не трапілі ў арганізаваны абарот, то, значыць, іх не атрымаюць у медыцыне, адукацыі, іншых сацыяльных сферах.

Аб маштабах «шэрага» рынку сведчаць лічбы, якія назваў **начальнік Галоўнага ўпраўлення Нацыянальнага банка Беларусі па Гродзенскай вобласці Аляксандр ПРЫШЧЫЦ.** У агульным аб'ёме рознічнага тавараабароту продаж на рынках у студзені — жніўні склаў 21,4 % (3129,5 мільярда рублёў). За гэты перыяд на рахункі прадпрымальнікаў паступіла 530 мільярдаў рублёў (альбо 16,9 % рознічнага тавараабароту). З гэтага вынікае, што 2599,5 мільярда рублёў (83,1 % рознічнага тавараабароту прадпрымальнікаў) знаходзіцца ў іх на руках, па-за банкаўскім абаротам. Штомесячны абарот «шэрага» рынку складае каля 325 мільярдаў рублёў — гэта параўнальна з аб'ёмам беларускіх рублёў, што накіроўваюцца ў месяц жыхарамі ўсёй вобласці на набыццё валюты ў банкаўскіх установах.

— Грашовая маса павінна быць збалансаванай з аб'ёмам тавараў, паслуг, і Нацыянальнаму банку неабходна дакладна ведаць пра тыя ці іншыя грашовыя плыні, каб задзейнічаць рычагі па іх павелічэнні альбо скарачэнні. Аднак невядома, што адбываецца з гэтай неарганізаванай грашовай масай, якая круціцца на нашым спажывецкім рынку, у пэўнай ступені аказваючы ціск і на валютны рынак, — зазначыў Аляксандр Прышчыц.

Пры гэтым няўжо цяпер ёсць падставы скардзіцца, што не створаны належныя ўмовы для працы суб'ектаў гаспадарання, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, з грашовай выручкай? У прыватнасці, адменены абавязак банкаў па вызначэнні ліміту астатку касы, парадку і тэрмінаў здачы выручкі. Таксама адменены ранейшыя абмежаванні па выкарыстанні наяўных грошай з выручкі: сума, якой можна скарыстацца для разлікаў на працягу аднаго дня, складае 300 базавых велічынь.

— Для тых, хто працуе з наяўнымі грашовымі сродкамі абсалютна празрыста, прадастаўлены ўсе магчымасці самім спланаваць свой бізнэс, выбраць найбольш спрыяльныя ўмовы. Пры гэтым зведзены да мінімуму ўплыў кантралюючых органаў і банкаўскіх устаноў, — лічыць Аляксандр Прышчыц.

Але найбольш дзейсны спосаб супраць утойвання альбо няправільнага адлюстравання выручкі — гэта аперацыі з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак.

### МЕНТАЛІТЭТ ПАКУПНІКОЎ АЛЬБО НЕЖАДАННЕ ПРАДАЎЦОЎ?

Сёлета на 1 верасня ў арганізацыях гандлю і сэрвісу Гродзеншчыны ўстаноўлены 5523 плацежныя тэрміналы для разлікаў банкаўскімі пластыкавымі карткамі. Нагрузка на адзін тэрмінал складае каля 170 картак пры сусветным стандарце 150-160. Такім чынам, па аснашчанасці імі мы ўжо не саступаем сярэднім паказчыкам у свеце.

Аднак у плане іх выкарыстання... За мяжой у рознічным гандлі з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак ажыццяўляецца каля 60—70 працэнтаў плацяжоў, а, напрыклад, у Нарвегіі — ажно 90 працэнтаў. Для параўнання: у Гродзенскай вобласці сёлета за восем месяцаў — 10,5 працэнта. Так, з пачатку года (7,8%) ёсць прагрэс, але да сусветнай практыкі нам яшчэ вельмі далёка. Чаму?

**Старшыня Гродзенскага абласнога Савета прафсаюза прадпрымальнікаў «Садружнасць» Валянцін БРАНЦЭВІЧ,** іншыя кіраўнікі і члены прадпрымальніцкіх структур казалі за «круглым сталом» пра недасканаласць заканадаўства, дадатковую фінансавую нагрузку ў сувязі з устаноўкай плацежных тэрміналаў, недастатковую інфармаванасць аб умовах іх набыцця, а таксама пра менталітэт пакупнікоў, якія яшчэ не прывучаны да безнаяўных разлікаў.

— Так, ёсць пэўныя пытанні, звязаныя з фінансавай адукаванасцю, менталітэтам пакупнікоў. Але, мне здаецца, за спасылкай на гэты менталітэт — нежаданне суб'ектаў гаспадарання праводзіць аперацыі з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак, — лічыць Аляксандр Прышчыц. — Там, дзе прадавец прапануе разлічыцца праз плацежны тэрмінал, працэнтаў 50-60 пакупнікоў так і разлічваюцца. А дзе няма зацікаўленасці, дык тэрмінал можа знаходзіцца і пад прылаўкам. Альбо спасылаюцца на нейкія прычыны, якія быццам перашкаджаюць безнаяўнаму разліку.

Свежы прыклад. Нядаўна Беларусбанк за свой кошт устанавіў 54 тэрміналы на прадпрыемствах адной структуры. Умовы ўсюды аднолькавыя. А вынік? Калі ў Лідскім рэгіёне форма безнаяўнага разліку набыла досыць някепскія абароты, то ў Гродне такія плацяжы мізэрныя, так бы мовіць, «для птушачкі».

Дарэчы, сёння існуе шмат розных спосабаў устаноўкі плацежных тэрміналаў. Гэта і іх набыццё самімі суб'ектамі гаспадарання, і іх арэнда. Таксама ў шэрагу банкаў разглядаюць магчымасці бясплатнай устаноўкі тэрмінальнага абсталявання ў гандлёвых кропках. У гэтай сувязі **начальнік упраўлення кантролю спажывецкага рынку і сферы паслуг Камітэта дзяржкантролю па Гродзенскай вобласці Святлана СІВЕРЧУКОВА** адзначае якасную працу Беларусбанка па прыцягненні сваіх кліентаў да безнаяўных разлікаў. Банк правёў конкурс сярод прадпрыемстваў, у тым ліку невялікіх, па разліках банкаўскімі пластыкавымі карткамі. У выніку, напрыклад, на прадпрыемствах грамадскага харчавання гэтая форма разліку павялічыла сваю прысутнасць амаль утрая.

Праўда, зацікаўлены не ўсе. Не ўсюды, напрыклад, улічваюцца транзітныя асаблівасці рэгіёна. Наколькі камфортна адчуваюць сябе турысты, у якіх не заўсёды ёсць беларускія рублі? Ці могуць яны заплаціць за абед банкаўскімі пластыкавымі карткамі? Каля сарака аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу ў вобласці тэрмінальнага абсталявання пакуль не маюць. Мінус і для тавараабароту, і для іміджу не толькі канкрэтнага прадпрыемства, але і ўсёй краіны.

Што ж тычыцца пазіцыі спажыўцоў у сферы грашовых разлікаў, то вось меркаванне **намесніка начальніка ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Гродзенскай вобласці Аляксандра ТРАЯНОЎСКАГА:**

— Работнікаў кантралюючых органаў значна менш, чым суб'ектаў гаспадарання. І пакуль мы не выхаваем у спажыўцоў тавараў і паслуг жаданне плаціць па безнаяўным разліку, атрымліваць чэк, адрыўны талон — праблема з «ценявым» грашовым абаротам не вырашыцца. Таму прапанова: размясціць на ўсіх рынках інфармацыю, што спажыўцы могуць і павінны разлічвацца банкаўскімі пластыкавымі карткамі, а таксама абавязкова патрабаваць дакумент, які пацвярджае пакупку тавару.

Дарэчы, па выніках «круглага стала» вырашана, што падобная сацыяльная рэклама павінна неўзабаве з'явіцца на ўсіх рынках, і, пэўна, не толькі там. Акрамя таго, у сталіцу будзе накіраваны шэраг прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства ў сферы грашовых разлікаў. А там, дзе не дапамогуць меры перакanання, не абыдзецца без пакарання.

— Аб'яўляем «вайну» парушэнням касавай дысцыпліны, з апрыходаваннем і ўлікам наяўных грашовых сродкаў. Праца ў гэтым кірунку будзе весціся ва ўзмоцненым рэжыме, — папярэджвае намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці Анатоль Дарожка.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■

## ПАДПІСАНЫ ПАГАДНЕННІ АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ Ў СФЕРЫ СУДАВОДСТВА

**Вышэйшы Гаспадарчы Суд Беларусі падпісаў пагадненні аб супрацоўніцтве з Вярхоўным судом Азербайджана і Гаспадарчым апеляцыйным судом Сербіі.**

— Вельмі важна, каб нашы суб'екты гаспадарання, якія размяшчаюць свой бізнэс у Азербайджане і Сербіі, адчувалі ўпэўненасць, што яны там атрымаюць прававую абарону, — адзначыў **старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларусі Віктар КАМЯНКОЎ.** — Аналагічным чынам, каб прадпрымальнікі гэтых краін без боязі ўкладалі інвестыцыі, адкрывалі свае прадпрыемствы ў Беларусі. Я з упэўненасцю магу сказаць, што падобныя пагадненні аб супрацоўніцтве паміж судамі дзейнічаюць вельмі эфектыўна, дазваляюць эфектыўна працаваць эканомікам краін. Таму мы стараемся ісці па гэтым шляху. У нас ужо заключаны дагаворы з судамі краін СНД, Венесуэлай, Кітаем, В'етнамам і іншымі краінамі. Сёння абмяркоўваем такі ж дагавор з Бразіліяй.

Пагадненне, паводле слоў **старшыні Вярхоўнага суда Азербайджана Раміза Якуб аглы Рзаева,** будзе спрыяць стварэнню адзінай судовай практыкі, а таксама ўніфікацыі заканадаўства, вырашэнню міжнародных эканамічных спрэчак на аснове агульных стандартаў. Пагадненне будзе садзейнічаць і ў цэлым развіццю ўзаемаадносін Азербайджана і Беларусі: «Паміж нашымі краінамі зараз вельмі моцныя і цесныя адносіны ва ўсіх галінах». Зацікаўлена ў больш цесным супрацоўніцтве з нашай краінай і Сербія, пераканаў **старшыня Гаспадарчага апеляцыйнага суда Сербіі Міраслаў НІКАЛІЧ.**

Дакументы былі падпісаны падчас II Міжнароднага форуму суддзейскага супольніцтва па пытаннях судовай абароны правоў, які адкрыўся ўчора ў Мінску. Ён прымеркаваны да 90-годдзя эканамічнага правасуддзя ў Беларусі.

**Надзея ДРЫЛА.**

## «НЯПАМЯТЛІВЫ» КІРОЎЦА І «БЛУКАЮЧАЯ» «ХОНДА»

**Увечары 36-гадовы мінчанін ехаў за рулём «Хонды» пасля працы дадому. Прыпаркаваўшыся, узгадаў, што трэба зайсці ў краму. Праз паўгадзіны ён быў ужо дома...**

— Жонка мінчаніна тым жа вечарам, таксама вяртаючыся дамоў, на звыклым месцы не знайшла іх аўтамабіля. Сужэнец сцвярджаў, што папросту... забыўся, дзе канкрэтна паставіў машыну. Ключы ад яе, дакументы, вадзіцельскае пасведчанне — усё было на месцы. Жанчына напісала заяву ў міліцыю з просьбай аб вышуку «Хонды», адзначыўшы, што сужэнец пакутуе на захворванне спіны і яму пастаянна трэба рабіць уколы, адно з пабочных дзеянняў якіх — часовая страта памяці, — паведаміла рэдакцыі **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе ДАІ Заводскага раёна г. Мінска Настасся ЗАБАЎСКАЯ.** — Супрацоўнікі ДАІ, якія праводзілі праверку, высветлілі, што «няпамятлівы» кіроўца ў той вечар здзейсніў два дарожна-транспартныя здарэнні. Пашкодзіўшы аўтамабіль, які быў прыпаркаваны на стаянцы каля крамы, парушальнік накіраваўся да свайго дома, па дарозе пратараніўшы яшчэ два аўтамабілі і металічную агароджу. Пасля чаго выйшаў з машыны і накіраваўся дадому, тым самым двойчы пакінуўшы месца аварыі. Прычыну «часовай страты памяці» парушальнік назваў работнікам ДАІ сам: ён купіў у краме бутэльку гарэлкі, выпіў яе і, у надзеі пасля гэтага ўдала даехаць дадому, сеў за руль... Ранкам наступнага дня грамадзянін падзеі вечара памятаў цьмяна...

Аўтамабіль адшукалі праз паўгадзіны. «Прапажу» эвакуявалі на штрафстаянку. Вернуць яе ўладальніку пасля візіту на прыём да начальніка ДАІ і выплаты немалых штрафаў. Вадзіцельскага пасведчання кіроўца можа пазбавіцца на тэрмін ад 3 да 5 гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Падпіска-2012

# «МАЁ ЖЫЦЦЁ БЕЗ ГАЗЕТЫ СТАНЕ ЗУСІМ НЕ ЦІКАВЫМ»

***Пад такім загалоўкам надоечы быў змешчаны ліст спадарыні П.М. з Мядзельскага раёна, у якім наша адданая падпісчыца з 64-гадовым (!) «стажам» перажывала, што не можа на чарговы квартал выпісаць «Звязду», бо не разлічыла: заплаціла за дровы, газавы балон, святло. «Грошы засталіся толькі на прадукты...».***

***Не маючы магчымасцяў выпісваць — каму б там ні было — газету за свае сродкі, рэдакцыя звярталася да чытачоў з просьбай зрабіць добрую справу — аформіць падпіску не толькі для сябе.***

Як і варта было чакаць, падпісчыкі «Звязды» ахвотна адгукнуліся: зрабіць падарунак 85-гадовай вясковай пенсіянерцы, якая жыве адна, хацелі многія... Аднак першай дапамогу прапанавала наша пастаянная чытачка з горада Крупкі. Пра сябе яна расказала, што «Звязду» вельмі любіць, бывала на яе прэзентацыях, ведае (завочна) журналістаў, сама працуе ў дзіцячым садку... Спыталі, як яе прозвішча-імя? Адказала, як у Адэсе, — пытаннем на пытанне: «А ці так гэта важна?»...

Куды важней — і сапраўды! — што чалавек, які 64 гады атрымліваў газету, будзе атрымліваць яе і далей! З чым, згадзіцеся, варта павіншаваць адну падпісчыцу, шчыра падзякаваць другой, а ўсім астатнім, хто хацеў бы заставацца са «Звяздой» і ў новым квартале, нагадаць: сёння яшчэ можна, яшчэ не позна сказаць пра гэта сваім паштальёнам. Альбо завітаць на пошту.

Загадзя ўдзячныя вам!

**P.S.** *Публікацыя ўзгаданага ліста з Мядзельшчыны выклікала не сказаць каб шырокі, але ж рэзананс у інтэрнэце. Змест яго зводзіцца да пытальнага, як, маўляў, не сорамна ў такім выпадку шукаць спонсараў?.. Можна ж скінуцца...*

***Ну вядома ж! Так, магчыма, і трэба было?! Але ж тады рэдакцыя не даведалася б, што выпісаць «Звязду» не толькі сабе, але і некаму іншаму (таму, хто вельмі хацеў бы, аднак не заўсёды можа) згодны... ДЗЯСЯТКІ (!) нашых пастаянных чытачоў. Яны тэлефанавалі і тэлефануюць прасілі адрас («...ну калі не гэтай «бабулі-пенсіянеркі», то іншай»), яны прапаноўвалі стварыць адмысловы падпісны рахунак, хваляваліся за тыраж адзінай (са штодзённых) беларускамоўнай...***

***І тым самым яшчэ раз даказалі, што самае вялікае дасягненне газеты — гэта яе чытачы, здольныя і зразумець адно аднаго, і дапамагчы.***

**Аддзел пісьмаў**

■

| Даты | Падзеі | Людзі |
|---|---|---|

**1767** год — створана Слонімская капэла Агінскага — прыдворны аркестр гетмана вялікага літоўскага М.К. Агінскага. Існавала да 1793 года. Абслугоўвала пастаноўкі Слонімскага тэатра Агінскага, балі, касцёльныя службы, рабіла канцэртныя паездкі. У розны час мела вялікі штат інструменталістаў і вакалістаў (да 53 чалавек). Ансамбль складаўся пераважна з палякаў і беларусаў, часткова — з прыгонных, якія атрымалі прафесійную падрыхтоўку. Сярод іх Райскі — адзін з таленавітых музыкантаў капэлы, прыгонны Радзівілаў. Сучаснікі адзначалі высокі прафесійны ўзровень аркестра, наяўнасць уласнага выканальніцкага стылю. Росквіт дзейнасці капэлы адносіцца да 1780-х гадоў. Пазней Слонімская капэла Агінскага прыйшла ў заняпад у сувязі з пераходам многіх музыкантаў у Нясвіжскую капэлу Радзівілаў.



**1924** год — у горнай вёсцы Фантана-Ліры ў Апенінах нарадзіўся Марчэла Мастраяні, вялікі італьянскі акцёр. «Я люблю людзей, люблю жыццё, — гаварыў ён. — Можа, менавіта таму і жыццё мне адказвала ўзаемнасцю. Сапраўды, я лічу сябе чалавекам, якому пашанцавала». У аповедах вялікага італьянскага акцёра аб яго кінематаграфічных сустрэчах, аб фільмах, якіх было больш за сто пяцьдзясят, угадваецца чалавек, які марыў ператварыць сваё жыццё ў вечнае кіно.

**1941** год — нарадзіўся (вёска Чырвоная Зорка Жыткавіцкага раёна) Віктар Уладзіміравіч Кончыц, беларускі вучоны ў галіне рыбаводства, доктар сельскагаспадарчых навук (2001). Аўтар навуковых прац па вырошчванні траваедных рыб, узнаўлення рыбы буфала ў кліматычных умовах Беларусі, тэхналогіі вядзення рыбаводства.

Было сказана

**Мікола Гусоўскі (1470—1533), беларускі паэт, гуманіст і асветнік:**
*«Дзяржава абапіраецца больш на мужнасць духу, чым на сілу цела».*

## Скараціўся пералік захворванняў, з якімі не бяруць у армію

**Скараціўся спіс захворванняў, па якіх прызнаюцца нягоднымі да вайсковай службы прызыўнікі і ваеннаабавязаныя, якія стаяць на ўліку ў ваенных камісарыятах і не маюць права на іншыя віды адтэрміновак, акрамя як па хваробе.**

Як паведаміў урач-эксперт аддзела прызыву на вайсковую службу ваеннага камісарыята Мінска Віктар Вятчынкін, гэта агаворана ў пастанове Міністэрства абароны і Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь № 33/85, якая ўвайшла ў сілу з 1 жніўня 2012 года.

Цяпер у армію могуць прызваць як гіпертонікаў, так і тых, хто хварэе на скаліёз другой ступені — з вуглом адхілення да 10 градусаў лежачы. Адсутнічаюць проціпаказанні і па язвавай хваробе, але толькі ў выпадках, калі няма перфарацыі і крывацёку, а абвастрэнні здараюцца не часцей за адзін раз на год і не патрабуюць працяглага лячэння. Такім прызыўнікам адкрыта дарога ў танкавыя падраздзяленні, на службу ў склад экіпажаў баявых машын, пускавых установак, па ахове аб'ектаў Узброеных Сіл, у злучэнні і воінскія часці радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны, зенітна-ракетных войскаў і іншыя. А вось у часцях сіл спецыяльных аперацый, унутраных войскаў МУС, КДБ, пагранічнай службы, дзе байцы павінны вытрымліваць высокія нагрузкі, прызыўнікам з падобнымі адхіленнямі ў здароўі служба проціпаказана.

**Ігар ГОЛАД, «Мінск-Навіны».**

### АБЗАЦ

◢ По звестках Белдзяржстата, доля продажу айчыннага абутку ў рознічным таваразвароце сёлета за чэрвень-ліпень была 64,1%, вопраткі — 64,7%, трыкатажных вырабаў — 78,4%, панчошна-шкарпэткавых вырабаў — 89,8%. Гэтыя лічбы спецыялісты канцэрна «Беллегпрам» звязваюць з тым, што беларусы ў многім памянялі сваю думку аб айчынным абутку і адзенні ў лепшы бок і сталі больш давяраць беларускім вытворцам.

◢ **Супрацоўнікі ўпраўлення КДБ па Брэсцкай вобласці спынілі дзейнасць 46-гадовага непрацуючага жыхара Брэста, які спрабаваў арганізаваць пастаўку ў Беларусь з Польшчы спецыяльных тэхнічных сродкаў, з дапамогай якіх можна негалосна атрымліваць інфармацыю. Пры спробе збыту ў яго канфіскаваны тэхсродкі, закамуфляваныя пад сонцаахоўныя акуляры, якія былі аснашчаны электроннай апаратурай — відэакамерай і дыктафонам. Дзейнымі нарматыўнымі прававымі актамі Беларусі і краін Мытнага саюза накладваецца абмежаванне на ўвоз такіх сродкаў на тэрыторыю Мытнага саюза. Апрача таго, у Беларусі іх абарот аднесены да ліцэнзаваных відаў дзейнасці. Заведзена крымінальная справа.**

### ПОЎНЫ АБЗАЦ



◢ У Цімашэўску Краснадарскага края пенсіянер выпадкова забраў з дзіцячага садка не свайго ўнука. Па звестках паліцыі, дзядуля зайшоў у групу, куды ходзіць яго ўнук, паклікаў хлопчыка па імені, і яму насустрач выбегла дзіця. Хлопчык пры гэтым сам крыкнуў: «Дзядуля!» Абодва пакінулі дзіцячы сад. А неўзабаве туды прыйшла жанчына, каб забраць свайго сына. Аднак яго ў групе не аказалася, і тэрмінова была выклікана паліцыя. Прааналізаваўшы сітуацыю, праваахоўнікі зрабілі выснову, што нехта проста пераблытаў дзяцей. Да ўсяго выхавальніца толькі што прыйшла сюды працаваць, не паспела пазнаёміцца з дзецьмі і іх бацькамі. Неўзабаве версія пацвердзілася — дзядуля з «няправільным « унукам вярнуўся. Яго адправіла з дому жонка, убачыўшы, што муж прывёў дадому чужога хлопчыка. Дзяцей памянялі, і сітуацыя шчасліва вырашылася.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА Ў АДНЫМ ФІЛІЯЛЕ

**На Магілёўскім вагонабудаўнічым заводзе адкрыўся філіял кафедры зваркі Беларуска-Расійскага ўніверсітэта. У Магілёве гэта лічаць знакавай падзеяй: навука прыйшла на вытворчасць.**

Студэнты цяпер правераць тэорыю на практыцы: усё ж такі заводскі цэх нельга параўнаць з лабараторыяй навучальнай установы, нават калі там ёсць самае сучаснае абсталяванне. Між тым на вагонабудаўнічым заводзе пайшлі ўніверсітэту насустрач і нават зрабілі аўдыторыю для заняткаў.

Карысць ад такога праекта відавочная для ўсіх бакоў. У філіяле кафедры будуць рыхтавацца добрыя спецыялісты, якія потым упэўнена прыйдуць у цэх і ўжо будуць дакладна ведаць, што і як ім рабіць. На заводзе лічаць, што вытворчасць якаснай і канкурэнтаздольнай прадукцыі цяпер немагчымая без цеснага супрацоўніцтва з навукай.

**Ілона ІВАНОВА.**


*Уважаемые акционеры ОАО «Технoприбор»!*

**9 октября 2012 года**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров**
**ОАО «ТЕХНОПРИБОР»,**
**расположенного по адресу: г. Могилев, ул. Гришина, 96.**

**Собрание пройдет по адресу: г. Могилев, ул. Гришина, 96, здание столовой ОАО «Технoприбор».**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О реорганизации ОАО «Технoприбор» путем присоединения к ОАО «Ольса».
2. Об утверждении договора о реорганизации ОАО «Ольса» путем присоединения к нему ОАО «Технoприбор».
3. Об утверждении изменений в устав ОАО «Технoприбор».
4. О выкупе простых (обыкновенных) акций ОАО «Технoприбор».

Регистрация участников внеочередного общего собрания: с 14.00 до 15.20 по месту проведения внеочередного общего собрания на основании документа, удостоверяющего личность.

Представитель акционера должен иметь доверенность, зарегистрированную в установленном порядке.

**Начало работы внеочередного общего собрания: 9 октября 2012 года в 15 часов 40 минут.**

Список акционеров для участия во внеочередном общем собрании будет составлен по состоянию реестра на 21 сентября 2012 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

*Наблюдательный совет*

**Тел. 8 0222 26 22 71.** УНП 700099501.

**Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:**

- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 1115446—1115450, 1079690, 0994862, 1011436, 0816166—0816260, 1115050, 0924898, 1104466—1104467;
- добровольное страхование от несчастных случаев 2РН, 2РП серия НС №№ 0000087—0000088;
- добровольное страхование строений; добровольное страхование домашнего имущества форма 2РН серия БИ №№ 0389523, 0390557;
- добровольное страхование гражданской ответственности владельцев квартир форма 2РН серия БИ № 0020582;
- квитанции 1 СУ серия КС №№ 3481725, 3474809, 0293924;
- добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско) 2РН, 2РП серия АК №№ 0051318—0051327.

УНП 100782388

Утерянный представительством Белгосстраха по Фрунзенскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БНН № 0006945 **считать недействительным.** УНП 101883943

Утерянный представительством Белгосстраха по Центральному району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0159444 **считать недействительным.** УНП 101883943

Утерянные представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №№ 0387470—0387471 **считать недействительными.** УНП 101883943

**ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ**

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества** | **Лот № 1. Контейнер, инвентарный № 00000260.** |
| **Собственник (владелец) имущества** | **ООО «РостЛизинг»** |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | **г. Новополоцк, пер. Рижский, 5** |
| **Стоимость имущества** | **Лот № 1 – 571 000 белорусских рублей** |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **г. Витебск, ул. «Правды», 32<br>24 октября 2012 года в 12.00** |
| **Информация об обременениях имущества** | **Обременений нет** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 321, http://vitebsk.court.by/, http://vitebsk@court.by/ судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел./факс: (80212) 49-13-43, (8-044) 734-93-00, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел.: (80212) 49-13-40 (8044) 746-73-00 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 % от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670, **не позднее 12.00 24.10.2012.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)**

**извещает о проведении 30 октября 2012 года повторного открытого аукциона со снижением по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование объекта | Адрес объекта | Продавец | Краткая характеристика объекта | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Здание очистных сооружений инв. № 350/С-135550, общей площадью 159,3 кв.м** | г. Гомель, ул. Интернациональная, д. 49 | Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Центрального района г. Гомеля. | Одноэтажное здание смешанных конструкций (кирпич, ж/б панели), перекрытия – ж/б плиты, электроснабжение. | **1 205 615 145** | **10 000 000** |

**Шаг аукциона – 5 %.** К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-16 по 29 октября 2012 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения.**

**Для участия в аукционе в адрес Организатора аукцион необходимо представить:**

1. Заявление на участие в аукционе; 2. Копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком; 3. Организациям – резидентам Республики Беларусь – доверенность представителю организации (кроме случаев, когда организацию представляет ее руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации (копию документа о создании организации, если она не подлежит государственной регистрации), заверенные юридическим лицом; 4. Индивидуальным предпринимателям – свидетельство о государственной регистрации; 5. Представителям физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность; 6. Организациям – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; 7. Организациям и физическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; 8.Представителям организаций и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица расчетного счета необходимо открыть текущий расчетный банковский счет в любом банке РБ. Проводится аукцион в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства (Указ Президента РБ от 04.09.2006 № 559 (в ред. Указа Президента РБ 05.12.2011 № 568) в силу 01.12.11.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.06.2012 г. и на сайте gomeloblreklama.by.

**Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет р/с № 3012209370018 в филиале ОАО «Белагропромбанк» Гомельское областное управление, код 912, ОКПО 02975763, УНП 400071204.**

**Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 18 78, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by**



# СПРАВА Ў КАПЕЛЮШЫ

**Віноўнікам і галоўным героем першай рэгіянальнай выставы — майстар-класа «Стаўбцоўскі капялюш» стаў просты саламяны галаўны ўбор, сёння дзіўны, нязвыклы, якім калісь прыкрывалі галаву ў любое надвор'е.**

У вырабе з матэрыялу, здабытага на жытнёвым полі, было ўтульна, прыгожа. У гарачыню саламяны капялюш не дае валасам узмакрэць, а ў холад ён сагрэе, аздобіць выгляд. На ініцыятыву кіраўніка народнай студыі «Пралеска» Стаўбцоўскага гарадскога Дома культуры Аліны Халявінскай адгукнуліся, акрамя мясцовых умельцаў, народныя майстры з Вілейшчыны і Уздзеншчыны. Радавалі вочы цудоўныя шкатулкі, вазы, казачныя героі — іх проста на выставе рабілі з падатлівай саломкі апантаныя любімай справай майстры Дзмітрый і Ірына Станкевічы, Алена Шаблыка (на здымку справа) з Крывога Сяла , што на Вілейшчыне; Канстанцін Пяцінкін (на здымку злева) з групай сяброў-аднадумцаў з гуртка народнай студыі «Чароўная саломка» Старасвержанскай сярэдняй школы Стаўбцоўскага раёна.

**Васіля ЗЯНЬКО, фота аўтара**.



## Чыстага паветра нялішні глыток

**Падчас акцыі «Дзень без аўтамабіля» ў гарадах краіны было зафіксавана змяншэнне колькасці аўто, якія ўдзельнічалі ў дарожным руху, — ад 2 да 12 працэнтаў у розных рэгіёнах у параўнанні з папярэдняй суботай.**

Апроч іншых вынікаў акцыі, якая прайшла практычна ва ўсіх гарадах Беларусі 22 верасня, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя называе і зніжэнне рэалізацыі аўтамабільнага паліва на запраўках — ад 1,8 да 4 і больш працэнтаў, што дазволіла папярэдзіць выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ў аб'ёме каля 150 тон. Гэтым былі папярэджаны экалагічныя наступствы на суму каля 2 мільярдаў рублёў у цэнах 2009 года. Была праведзена праца па ачыстцы дваровых тэрыторый ад кінутых безгаспадарных транспартных сродкаў: убрана больш за 200 аўтамабіляў і рэшткаў кузаваў.

У дзень правядзення акцыі ў шэрагу гарадоў Брэсцкай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей быў арганізаваны бясплатны праезд у гарадскім грамадскім транспарце па прад'яўленні вадзіцельскага пасведчання і рэгістрацыйных дакументаў на аўтамабіль.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## НА СТАЛІЧНАЙ БУДОЎЛІ ЗАГІНУЎ РАБОЧЫ

Трагічны выпадак адбыўся ў Мінску на скрыжаванні праспектаў Дзяржынскага і Жукава. Тут вядзецца будаўніцтва шматкватэрнага дома з аб'ектамі сацкультбыту. Пры разгрузцы паддон з цэментам на ўзроўні восьмага паверха абрынуўся ўніз. Уся маса вагой каля тоны накрыла манцёра субпадраднай арганізацыі, які стаяў пад грузам. Брыгада хуткай канстатавала смерць 28-гадовага мужчыны. Па факце здарэння праводзіцца разбор.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


РЕСПУБЛИКАНСКИЙ ИНСТИТУТ КИТАЕВЕДЕНИЯ ИМЕНИ КОНФУЦИЯ
БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

- Знакомство с традиционной китайской культурой и искусством;
- Изучение китайского языка (группы для детей и взрослых);
- Стажировки и обучение в Китае;
- Проведение международных экзаменов по китайскому языку HSK/YCT/BCT;
- Подготовка к сдаче экзамена HSK;
- Занятия проводят высококвалифицированные преподаватели из Китая;
- Фестивали китайского кино

и многое другое

NEW «Искусство китайской каллиграфии»
«Бизнес китайский»



г. Минск, ул. Московская, д. 15/
Тел./факс: +375(17) 222 79 22,
e-mail: uniconfbel@rambler.ru
сайт: http://rci.bsu.by/

УНП 100235722


■ Простая мова

# ГЭТА — ВОСЕНЬ

**...З намі, жанчынамі, так бывае: ідзеш у свае 30... 40... 60... па вуліцы і адчуваеш, што на цябе глядзяць — мужчыны (у тым ліку — зусім маладыя)... І жанкі... Ды што там — нават дзяўчаты!**
**Ад чаго неяк міжволі, сама па сабе, «выраўноўваецца спіна» і ў галаву (не сказаць, каб задраную, проста паднятую — ад зямлі) пачынаюць прыходзіць думкі. Ну, што сапраўды — відаць, пасуе табе гэты касцюмчык?.. І што да яго, хай не адразу, але ж удала падабраліся туфлікі, а потым і сумка... Што сяброўка малайчына: падарыла добры танальны крэм, а сябар — духі. Што варта і надалей неяк выкройваць раніцай час на прычоску, на макіяж. (А найперш бы — на сон!)... І што наогул — яшчэ не вечар, што прыгажосць, калі яна ёсць...**
**Гэтае «адкрыццё» падбадзёрвае, можа, нават акрыляе, яно нясе цябе да бліжэйшага люстэрка і...**
**І першае, што там бачыш — жоўценькі бярозавы ліст, які заблытаўся ў тваіх валасах, прыцягнуўшы тым самым позіркі. І спарадзіўшы думкі.**

## Ёсць сэнс?

Кацю ў бальніцу забралі — з малой. Ад'язджаючы, адчыніла халадзільнік, паказала мужу, што можна з'есці сёння, што заўтра.

Ён аж пакрыўдзіўся: я ж, маўляў, не малы — неяк перакантуюся.

І кантаваўся — дні тры. На чацвёрты (сам распавядаў) надумаў кашы зварыць. Насыпаў у каструлю грэчкі, наліў вады, уключыў пліту і тэлевізар — у суседнім пакоі. Сеў там. Падумаў яшчэ, што баба — стварэнне само па сабе цікавае, але ж бесталковае, недасканалае. Вось, напрыклад, што яна цэлы вечар можа рабіць на кухні? Які сэнс таптацца там, стаяць ля пліты?

Пакуль разважаў так, з кухні пацягнула дымком. Грэчка знізу падгарэла, зверху была сырая і пахла, мякка кажучы, вельмі непрыемна. Выкінуў. Замачыў гэтую каструлю, узяў другую. Наліў вады, насыпаў круп, памяшаў, зноў пайшоў глядзець тэлевізар...

У выніку — не еўшы лёг, не спаўшы ўстаў, бо застаўся галодным і да 12 ночы мыў каструлі. Назаўтра жонку папрасіў:

— Слухай, ты напішы мне, як кашу варыць. Толькі падрабязна... Я не думаў, што будуць цяжкасці...

Гэта з даўняга. З нядаўняга.

У тралейбус натоўпам «занесла», ля хлопца маладога прыста701віла. Ён па мабільным размаўляў. Пытаў у некага:

— Колькі, колькі рысу трэба?

Праз паўзы:

— А вады?.. Каб яго закрывала?.. На колькі пальцаў?.. Тваіх ці маіх?.. А доўга варыць?... Штошто зрабіць, каб ён не зляпіўся? Ага!..

Курс «маладога байца», трэба разумець. Альбо студэнта. Да сваіх 17 ён тую кашу еў і ў думках не меў, як яна там зварана. Зараз — трэба самому...

Яшчэ, магчыма, і для таго, каб навучыцца... паважаць тую абсалютна «бессэнсоўную» жаночую тупаніну — паміж ракавінай, плітой і халадзільнікам.

## Адным радком

Студэнцтва ў гарады з'язджаецца: у канцы жніўня, на пачатку верасня — павышаны попыт на жытло, ці не ўсе слупы аблеплены то кідкімі, то ўмольнымі «Увага!...», «Усім! Усім! Усім!...», «Дапамажыце...», «Здымем...», «Здыму...». Нават «Дорага!», бо — «Тэрмінова...» і «Патрабуецца...».

Каму?

У тым ліку (даслоўна) — маладой сям'і без шкодных звычак, дзяцей і жывёл.

Усё змяшалася.

## Кропелька

Змяшалася і сапраўды. У Ніны старэйшая дачка — «копія бацечкі». Да танцаў, да «пагуляць» — агонь: чарнявая, рухавая, смелая...

Малодшая ў Ніны — таксама копія. Бацечкі. Праўда, ужо іншага. Ён — поўная процілегласць першаму: эстонец — высокі, бялявы, а ўжо маруда... І ў думках, і ў рухах, і ў словах... Можа, таму, удачарыўшы першае жончына дзіця, ні разу не прагаварыўся (за 16 гадоў!), ні разу віду не падаў, што дачка не родная. Абедзвюх — такіх непадобных — аднолькава любіць, жонка не можа папракнуць.

І яна ж не можа даўмецца: маці ў гэтых дзяўчынак адна, сям'я — адна, выхаванне — адно, а вынікі — абсалютна розныя. І было б з-за чаго? З-за... «насення», — малюсенькай яго кропелькі.

## Хто пойдзе?

Раніца. Паліклініка. Доўгі калідор з безліччу людзей, з безліччу дзвярэй. На адных — надпіс: «Афтальмолаг». І чарга — з уласцівымі ёй размовамі:

— Катаракта — найгоршая з хвароб, — скардзіцца адзін з дзядоў-пацыентаў. — З-за яе на левае вока амаль нічога не бачу. І на правым аперацыю трэба рабіць. Добра, як добра, як пашанцуе, а як не? Баюся...

— Дык не рабі, — раіць яму другі з дзядоў. — Я сваю катаракту каторы год на аптэчных кроплях трымаю...

— Хм, катаракта... Хваробу знайшлі, — бурчыць іх сусед па лаўцы. — У мяне во — глаўкома, халера на яе. Нічым не лечыцца!..

Як і варта чакаць, у спрэчку старых пра найгоршыя хворасці ўступае крыху маладзейшы:

— Спадарства, хваробы вачэй — усе і цяжкія, і дрэнныя. Бо памрэш і не ўбачыш, хто пойдзе за труной, а хто — не...

Дзяды, у адрозненне ад іншых «чаргавікоў», не ўсміхаюцца, яны... згодна маўчаць. Трэба разумець, хацелі б пабачыць, хто сапраўды пойдзе, а хто, можа, і не.

## На вока

Пасля ўсяго, што на галовы людзей «выліла» рэклама, забароненых тэм няма.

Сталіца, крама, дзве кабеты паблізу. Старэйшая — па ўсім відаць — тут не ўпершыню, бо, паводзіць сябе амаль як гаспадыня, малодшая ж — наадварот: баіцца ступіць, павярнуцца, з нейкім стоеным жахам глядзіць на безліч развешаных паўсюль жаночых маечак, трусікаў, пеньюараў, бюстгальтараў...

— Выбірай, — спыніўшыся ля іх, загадвае першая, — я заплачу... За два. Гэта мой падарунак будзе.

— Не, ты што, — пратэстуе другая (ужо ўбачыўшы кошт), — задорага... Ды і ёсць у мяне.

— Я ведаю, што ў цябе ёсць, — абрывае старэйшая. — Выбірай!

Хвілін на пяць ці дзесяць жанчыны разыходзяцца — паасобку нешта мацаюць, разглядаюць.

— Ну тады, можа, гэтыя возьмем? — нясмела пытае малодшая. — Павінны падысці.

— Зараз памераеш, — пазіраючы ў бок свабоднай кабінкі, загадвае «гаспадыня».

— А што, хіба можна? — ці то здзіўляецца, ці то палохаецца «госця». — Ды і навошта? Я ж свае грудзі ведаю, на вока бачу: «чашачкі» будуць якраз, а калі па аб'ёме крыху зашмат, дык можна ўшыць. Я заўсёды гэтак раблю... І нашу...

Медыкі ў СМІ цяпер часта выступаюць і чым толькі не тлумачаць рост анкалагічных захворванняў (у тым ліку — малочнай залозы): дрэннай экалогіяй, няправільным харчаваннем, стрэсамі і г. д. Усім, чым заўгодна! Але не тым, што мільёны жанчын па-ранейшаму «на вока» падбіраюць сабе ліфчыкі.

## Факт...

— Во папёрла, во папёрла старому, глянь, — паказаў адзін маладзён другому.

Хоць мог бы і не паказваць, бо гэтая (іх мовай) «пруха» відаць была ўсім і здалёк: высокі ссівелы мужчына вёў пад руку саму пяшчоту, саму прыгажосць — пышнавалосую, светлатварую маладзічку ў доўгім квяцістым сарафане, зверху прыкрытым шалікам, вёў вельмі далікатна, вельмі беражліва — па шумнай сталічнай вуліцы, па прыступках метро...

Ды і ў вагоне... Усадзіў (што замілавала — ні на міг не адпусціўшы рукі), сеў побач: неяк паўбокам, трэба разумець, каб бачыць яе — хоць краёчкам вока, і каб пачуць, калі нешта скажа...

Але прыгажуня яго маўчала: разгублена, ва ўсе вочы, быццам бачачы ўпершыню, разглядвала сцены вагона, аблепленыя яркай рэкламай, людзей, што стаялі паблізу, доўгімі, тонкімі пальцамі раз-пораз перабірала, папраўляла на грудзях шалік, бо ён — вялікі, шаўковы — зусім не слухаўся, не хацеў ляжаць на плячах (скразнякі ў метро): ён настойліва некуды рваўся...

І такі ж вырваўся! Хоць адным сваім рогам... Агаліўшы пры гэтым... бінты — там, дзе павінны быць грудзі.

...З метро гэтыя двое выходзілі на Кастрычніцкай — у вірлівы натоўп, што мае здольнасць паглынаць усё. І ўсіх... У тым ліку — саму пяшчоту ў пары з самою мужнасцю.

Не факт, што бацькавай. Не факт, што братняй ці мужавай. Не факт, што сяброўскай...

Факт, што «прухі» такой не жадаў бы і ворагу.

## Шчаслівыя

Холад. Змрок. Галоўнае — на гадзінніку як быццам не вечар, а ліхтары ўжо запалены.

Пад адным, на аўтобусным прыпынку — мужчына... Сталага веку. З кніжкай — стаіць, чытае...

Шчаслівы...

Не кажучы ўжо пра аўтара... Які — ну напісаў жа (змог!)... Ды так — што не адарвацца, не кінуць! Нават на холадзе, пад ліхтаром... Шчаслівы!

## Сіла слоў

Зноў горад, прыпынак. І зноў мужчына: нічога незвычайнага, у іншыя дні на яго б не глядзеў. Аднак сёння...

Сёння ён, мусіць, з крамы едзе: плінтусы вязе — доўгія, празрыстай стужкай «спавітыя», а ўжо ж патрэбныя! Раз-пораз гаспадар пагладжвае іх, раз-пораз — замілавана аглядае. Трэба разумець, задаволены, што купіў, што вось зараз прывязе — дадому...

А гэта, між іншым, не так і проста: у заднія дзверы аўтобуса мужчына спачатку асцярожна ўсоўвае адзін канец сваёй доўгай пакупкі, потым заносіць другі. І ўсё ж за нешта чапляе, бо адтуль на ўсю пляцоўку грыміць жаночае:

— Э-эй... Калготы парвеш! Лезеш са сваім барахлом!

— Гэта не барахло, — бубніць мужчына. — Гэта плінтус, дубовы... дарагі...

— Ды ўжо ж — «да-ра-гі», — перакрыўляе яго кабета, — не даражэй, чым мае калготы!

Мужчына (хапае розуму) ёй не пярэчыць. Ён мосціцца ў куток за дзвярыма — вязе пакупку, якая (па ўсім відаць) болей не цешыць яго, не грэе.

І, магчыма, не будзе — нават праз гады.

## Толькі там

Дашка — учарашняя школьніца — замуж выходзіць.

— Ой, а за каго ж? — пытаюць у яе аднакласніцы.

— Ды вы не ведаеце, ён не тутэйшы... На лётчыка вучыцца, — з форсам адказвае дзяўчына. — Апошні курс ужо.

— Ух ты! І ён кахае цябе! А ты яго! — зайздросцяць дзяўчаты.

— Ён — так, кахае... А я?.. Ну не сказаць, каб моцна... Але ж дзе я іншага з такой зарплатай знайду?

...Хіба ў небе?

## Хто вінаваты

Вечар, горад, амаль пустая маршрутка... Спадарожніка хвілін праз 10 ці не чэрці ўцягнулі — п'янага, з расшпіленымі клінамі.

Але ж дзякаваць Богу — ціхага і ў прыгожай адпрасаванай сарочцы (ён тварам у салон сядзеў — хоць-нехаць разгледзіш), у чыстым абутку...

Значыць, з дому — ад жонкі ці маці — пайшоў чалавекам...

А вернецца зараз свіннёй...

Гарэлка вінавата?

## Не хлеб

Пасля працы што ні гастраном, то чарга. Нам у ёй — стаяць і стаяць, бо з касіркай не пашчасціла: працуе — як мерзлае гарыць. Затое побач, за суседняй касай — ці не лепшая па прафесіі! Прынамсі, кожнаму з пакупнікоў усміхаецца, з кожным вітаецца, у кожнага пытае, ці патрэбен пакет, мігам «прабівае» пакупкі, мігам адлічвае грошы, дзякуе і зноў жа кожнага прыязна запрашае: «Прыходзьце заўтра».

Людзям, нічым падобным пакуль не распешчаным, гэта, відаць, падабаецца: дзяўчыне дзякуюць, абяцаюць і насамрэч прыйсці...

Дзяцюк хіба зазлаваўся:

— Заўтра, — буркнуў, — яшчэ не трэба будзе.

...Ён прэзерватывы на касе браў — вялікі пачак.

## Гэта — восень

...Светлы элегантны касцюмчык, крэмавыя «шпілечкі», на шыі — яркая хусцінка.

— Вы сёння ў тэатр, няйначай!? — пытаюся ў суседкі.

Тая адной усмешкай дзякуе за камплімент, на імгненні святлее тварам. І тут жа цямнее:

— Не... Не ў тэатр. На пенсію адпраўляюць — апошнія дні на працу хаджу. Дык во — штодня прыбіраюся... Бо потым — куды?

...Светлы элегантны касцюмчык, крэмавыя «шпілечкі», яркая хусцінка... Гэта — восень. Прадчуваннем зімы.

**Валянціна ДОЎНАР**.

***АД ЯЕ Ж***

***Вы не паверыце (як любяць паўтараць на адным з расійскіх каналаў, бо пакуль не веру і сама), але з такіх вось абразкоў-карацелек мала таго што злажылася, выйшла ў свет (у выдавецтве «Харвест», за што яму асобны дзякуй!) яшчэ адна кніжка. Называецца яна «Каб сказаць... І пачулі». Так што прыхільнікі «Простай мовы» змогуць завітаць у кнігарні — пацікавіцца...***

***Ну а тым, хто набудзе, прачытае (марыць не шкодна: можа, і пад ліхтаром?) ды параіць іншым, ДЗЯКУЙ асобны!***

***Бо яно ж і насамрэч — мала нешта сказаць. Хочацца, каб пачулі.***

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, г. Дзяржынск.



## «Па грыбы»

**Па гарызанталі: 3.** ... ляцяць нізка — зіма ўжо блізка (прык.). **8.** Гарадскі пасёлак на Віцебшчыне, раённы цэнтр, якому сёлета споўнілася 460 гадоў з часу першага згадвання. **9.** Квашаная гародніна; увосень яе, каб захаваць на зіму, квасілі, салілі і складалі ў бочкі. **10.** Сукупнасць сродкаў і прыёмаў для дасягнення мэты. **13.** «Халадзеюць ночы. Шлях ярчэе зорны.\\Дні ідуць на ...». З верша Я. Коласа «Восеньскае». **14.** «Дацвітае ў імшарах лаза і крушына,\\І зялёным агнём дагарае ... «. З верша М. Танка «Восенню». **15.** Дзіцяня авечкі. **18.** Стромкая скала. **19.** Тое, што і жудасць. **22.** Час не ... : не падгоніш і не прыпыніш (прык.). **23.** Восень кажа: «Я ўраджу», а ... адказвае: «Пачакай, як дагаджу» (прык.). **25.** «... зладзілі к выраю ў згодзе і складу». З верша Я. Купалы «Буслы». **29.** «... было,\\Розна зеллечка цвіло;\\Восень настала,\\Розна зеллечка звяла». З беларускай народнай песні «Ой, восень, восень». **31.** ... — на дзень пагод восем (прык.). **32.** ... кажух латае, Палагея рукавічкі вяжа (прык.). ... — свята беларускага народнага календара, якое адзначалася 21 кастрычніка. **33.** ..., або тушонікі. Тушаная бульба.

**Па вертыкалі: 1.** Група музыкантаў. **2.** «Ідуць у брусніцы\\Дзеўкі, маладзіцы,\\А Міхася цягне\\... і хвайнічок». З паэмы Я. Коласа «Міхасёвы прыгоды».(«Грыбы»). **3.** «Адборныя ... зярняты\\Саджае сяўнік у гектары». З верша Я. Купалы «Новая восень». **4.** Прыгожая садовая восеньская кветка. **5.** ... Шаптун, або ... Кураед. Свята беларускага народнага календара, якое адзначалася 9 кастрычніка. **6.** Лік, які фігуруе ў многіх абрадах; на восеньскія Дзяды гаспадар ... разы са свечкай абыходзіў стол перад вячэрай і інш. **7.** «Пайшлі ў кошык ... ,\\Сыраежкі і рыжыкі». З верша М. Танка «Мухамор». **11.** Тое, што плавае ў паветры падчас бабінага лета, якое на Беларусі пачынаецца ў канцы верасня і заканчваецца ў пачатку кастрычніка. **12.** На Беларусі даўні звычай давясельнага абраду — сватання, які пачынаўся звычайна ўвосень, пасля заканчэння ўборкі ўраджаю. **16.** «Адспявала лета ... ,\\Усе сабрала каласы». З верша Я. Пушчы «А ў бары, бары сасонкі». **17.** Невялікі калючы звярок, які ўпадае ў спячку ў кастрычніку. **20.** Свята беларускага народнага календара (14 кастрычніка), на якое людзі прыносілі святым каменням свае ахвяраванні, просячы ў іх здароў'я і дабрабыту. **21.** «Тым часам Спас святы мінуўся,\\І лес у ... апрануўся.\\Дрыжаць у золаце асіны». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Падгляд пчол».). **24.** Апісанне чаго-небудзь у агульных рысах. **26.** Музычны смычковы інструмент. **27.** У кастрычніку і ... з дровамі, і мужык з лапцямі (прык.). **28.** У ... дроў не возяць (прык.). **30.** «А баравік — тут ...\\І рыжык — добры бражнік -\\Знаходка для мужчын». З верша П. Панчанкі «Мінск едзе па грыбы».

**АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ:**

**Па гарызанталі:** 3. Жураўлі. 8. Расоны. 9. Варыва. 10. Тактыка. 13. Спад. 14. Атава. 15. Ягня. 18. Уцёс. 19. Жуда. 22. Конь. 23. Васна. 25. Шнур. 29. Лецечка. 31. Восень. 32. Трыфан. 33. Тушанка.

**Па вертыкалі:** 1. Аркестр. 2. Бор. 3. Жыта. 4. Астра. 5. Іван. 6. Тры. 7. Казлякі. 11. Павуцінне. 12. Аглядзіны. 16. Песні. 17. Вожык. 20. Пакровы. 21. Чырвань. 24. Схема. 26. Альт. 27. Хата. 28. Лес. 30. Чын.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 7.06 | 18.53 | 11.47 |
| Віцебск | — 6.56 | 18.42 | 11.46 |
| Магілёў | — 6.56 | 18.43 | 11.47 |
| Гомель | — 6.53 | 18.40 | 11.47 |
| Гродна | — 7.22 | 19.08 | 11.46 |
| Брэст | — 7.22 | 19.09 | 11.47 |

### Месяц

*Поўня 30 верасня.*
*Месяц у сузор'і Рыбы.*

### Імяніны

***Пр.*** *Людмілы, Марыі, Дзмітрыя, Івана, Ігната, Іосіфа, Мікалая, Мікіты, Сцяпана.*
***К.*** *Вацлава, Лаўрэнція, Марка, Сымона.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Ігар штодзень купляе адзін пачак цыгарэт, а выкурвае два. Пытанне: колькі людзей не любяць Ігара?**

Двое сяброў.

— Запісаў сваю на секцыю па тайскім боксе...

— І?..

— Ведаеш, падлогу мыць так цікава, а без мыцця посуду больш жыць не магу.

**Нядаўна адвучыў сваю жонку купляць усякія кніжкі кшталту «Як стаць шчаслівай і прыгожай за 2 тыдні», проста паказаўшы фота той, якая іх піша.**

— Я табе рэкамендую не нервавацца. Твае нервовыя клеткі, ці ведаеш, не аднаўляюцца.

— А я табе рэкамендую замаўчаць! Твае зубы маюць такую ж уласцівасць!





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 26.130. Індэкс 63850. Зак. № 4283.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 27 верасня 2012 года.